

# «ДАВАЙЦЕ ВЫБУДОЎВАЦЬ НАШУ ПАЛІТЫКУ І ПАЗІЦЫЮ ТАК, КАБ БЫЛО НАРМАЛЬНА І КАМФОРТНА ПРАЦАВАЦЬ»

(Працяг на стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 МАЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 98 (30486)



**+TV ПРАГРАМА**

«У НЕБЕ — «НАЧНЫЯ ВЕДЗЬМЫ»

АЗДАРАЎЛЕННЕ

## ЛЕТА ЗАБРАНІРАВАНА

**Чым будуць здзіўляць беларускія санаторыі ў сезон адпачынкаў?**

Айчынныя здраўніцы летам будуць працаваць з поўнай загрузкай. Для гэтага пастаянна паляпшаецца іх матэрыяльна-тэхнічная база — будуюцца новыя карпусы, закупляецца самае сучаснае медыцынскае абсталяванне, з'яўляюцца новыя методыкі лячэння. Для прыцягнення больш маладых адпачывальнікаў змяняецца і сам фармат санаторна-курортнага аздараўлення: сёння гэта размяшчэнне атэльнага тыпу, «шведскі» стол, абсталяванне тэрыторыі варкаўт-пляцоўкамі, вулічнымі трэнажорамі і нават полем для гольфа, а пляжаў — сучаснымі шатрамі, навесамі і іншай мэбляй. І ўсё гэта і знешне, і па напаўненні зусім не саступае замежным курортам. Высветлілі, які чакаецца ў беларускіх здраўніцах летні сезон і што прапануецца наведвальнікам.







СТАР. 7



ДОБРЫЯ НАВІНЫ ДЛЯ СПОРТУ 15



ДЗЕ І КАЛІ ЗДАЦЬ ЦЭ? 8-9

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

## ПАЧАТАК НОВАГА ЖЫЦЦЯ

**Апошні званок празвінеў для 1,7 тысячы выпускнікоў на рэспубліканскім свяце ў Гомелі**

Гомель — маладзёжная сталіца — 2025 — прыняла ўчора Рэспубліканскае свята для выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі «Апошні званок». Выпускнікі з усёй краіны прыбылі ў Гомель, каб разам адзначыць гэтую знакавую для іх падзею.

СТАР. 8



Фота gp.by

ISSN 1990 — 763X

# «МЫ НІКОЛІ ВАС НЕ ПАДВОДЗІЛІ І НЕ ПАДВЯДЗЁМ»

## Праблем у адносінах з Кітаем няма, ёсць жаданне рухацца далей

**Паміж Мінскам і Пекінам тысячы кіламетраў, але адлегласць не перашкода для паважлівага і эфектыўнага супрацоўніцтва, якое Беларусь і Кітай выбудоўваюць не адзін дзясятак гадоў. І, нават з улікам значных дасягненняў, працэс гэты не спыняецца. Пацвярджэнне таму — візіт кітайскай дэлегацыі ў нашу краіну на чале з віцэ-прэм'ерам Дзяржсавета Кітайскай Народнай Рэспублікі Лю Гачжунам. Дэлегацыя правяла перагаворы з членамі ўрада, а ключавой падзеяй візіту кітайскай дэлегацыі сталі перагаворы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.**

«Мы вас у Беларусі вітаем не толькі як высокую службовую асобу, але перш за ўсё як пасланца дружалюбнага нам кітайскага народа, вялікай кітайскай дзяржавы», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка.

Лю Гачжун адказвае за супрацоўніцтва з Беларуссю, гэтак жа як першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў адказвае за развіццё адносін з Кітаем. «Павінен сказаць, што дзякуючы вам мы значна прасунуліся ў нашых адносінах у канкрэтных кірунках. Мы сустракаемся з многімі дзяржавамі і падпісваем мемарандумы, пагадненні аб намерах. А з вамі мы ўжо даўно рэалізуем канкрэтныя кантракты. І ў гэтым вялікая заслуга вас і вашых калег», — адзначыў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, усё пералічанае не памяншае і заслуг Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна, якога Аляксандр Лукашэнка назваў сваім даўнім вялікім сябрам. «Калі б не той паварот з прыходам яго да кіраўніцтва партыяй і дзяржавай, то, напэўна, гэтых дасягненняў не было б. І, магчыма, мы б з вамі сёння не сустракаліся», — адзначыў ён.

«Не мне вам тлумачыць, мы жывём у даволі складаны супярэчлівы час, часта задумваемся, хто ж у нас сябар, хто перастаў быць сябрам, хто па той бок барыкад размясціўся. Але вы павінны ведаць і, я ўпэўнены, вы гэта добра ведаеце, што Беларусь з'яўляецца надзейным сябрам Кітая і кітайскага народа, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І не таму, што гэта складаны час і ён няпросты для нашай эканомікі перш за ўсё. А таму што мы з вамі ўжо не першае дзесяцігоддзе выбудоўваем такія адкрытыя сяброўскія адносіны. Таму будзьце ўпэўненыя, што тут, у цэнтры Еўропы, у вас ёсць надзейныя сябры, якія гатовыя садзейнічаць не толькі нашым адносінам, але і вырашэнню тых вялікіх пытанняў, якія перад сабой ставіць Кітайская Народная Рэспубліка, рэалізуючы перш за ўсё «Пояс і Шлях» па многіх кірунках. Мы ніколі вас не падводзілі і не падвядзём».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на гэтым усепагодным шляху заўсёды ёсць пэўныя складанасці і цяжкасці. «Не скажу, што іх нямала, але ў адносінах з Кітаем іх зусім нямнога. На наша задавальненне, праблемных пытанняў у нас няма. Але заўсёды ёсць жаданне рухацца далей», — сказаў ён.

Лю Гачжун у сваю чаргу перадаў беларускаму лідару цёплыя прывітальныя словы ад Сі Цзіньпіна. «Апошнія гады кітайска-беларускія адносіны дэманструюць станоўчую дынаміку развіцця і выйшлі на беспрэцэдэнтны ўзровень усепагоднага, усебаковага стратэгічнага партнёрства. Гэта стала магчыма, вядома, дзякуючы стратэгічнаму кіраўніцтву лідараў нашых краін, а таксама з'яўляецца выдатным вынікам пастаяннага ўмацавання палітычнага ўзаемадаверу, нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і ўшчыльнення двухбаковага ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне», — адзначыў ён.

Лю Гачжун назваў Беларусь незаменным сябрам і для Кітая і для кітайскага народа. Ён прызнаўся, што гэта яго першая паездка ў нашу краіну, але яшчэ да свайго візіту ведаў пра Беларусь. «Вашы поспехі ў паляпшэнні эканамічнага развіцця і дабрабыту, прафесіяналізм, адказнасць нашых беларускіх калег, іх сімпатыя да Кітая, да кітайскага народа пакінулі ў мяне глыбокае ўражанне, — падзяліўся Лю Гачжун. — Пад вашым кіраўніцтвам Беларусь дасягнула ўражальных поспехаў па ўсіх кірунках нацыянальнага развіцця. Будучы добрым сябрам і надзейным партнёрам вашай краіны, Кітай гэтаму толькі рад».

Лю Гачжун расказаў, што мэта яго візіту ў Беларусь — рэалізаваць дамоўленасці, якія былі дасягнуты на вышэйшым узроўні, умацаваць двухбаковы парадак супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі, каб ён прынёсіў больш практычных дасягненняў.

Напярэдадні перагавораў з Прэзідэнтам у Мінску прайшло пасяджэнне беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве з удзелам першага намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі Мікалая Снапкова і віцэ-прэм'ера Дзяржсавета КНР Лю Гачжуна. Па выніках пасяджэння падпісаны пакет дакументаў. Сярод іх — мемарандум аб узаемаразуменні па ўмацаванні інвестыцыйнага супрацоўніцтва ў сферы лічбавай эканомікі, пратакол камісіі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях і Міністэрства навукі і тэхналогій КНР па вызначэнні флагманскіх праектаў на 2025—2026 гады. У пратаколе пасяджэння міжурадавага камітэта замацаваны намер аб'явіць 2026—2027 гады ў беларуска-кітайскім супрацоўніцтве тэматычнымі гадамі прамысловай кааперацыі.

# «ДАВАЙЦЕ ВЫБУДОЎВАЦЬ КАБ БЫЛО НАРМАЛЬНА



Фота БелТА.

**У Палацы Незалежнасці — кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў кадравыя рашэнні аб кіраўніках мясцовай вертыкалі. І, па традыцыі кадравых дзён, абазначыў перад імі ключавыя задачы, важныя як для кожнага асобнага раёна, так і для краіны ў цэлым.**

## «УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ВАС»

Перад гэтым кіраўнік дзяржавы правёў перагаворы з намеснікам прэм'ера Дзяржаўнага савета Кітая Лю Гачжунам. Паводле яго слоў, той факт, што дэлегацыя такога высокага ўзроўню прыбыла ў Беларусь, сведчыць: кітайскія партнёры зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з нашай краінай. «Але ж за гэтым стаяць доўгія дзесяцігоддзі, нават не гады нашай работы з кітайцамі. Гэта вельмі цікавая, мудрая, сур'ёзная нацыя, якая проста так нічога не робіць. І перш чым робіць, яна пераконваецца ў тым, ці можна з намі працаваць. Я гэта сказаў, каб вы разумелі, што ў аснове ўсяго гэтага — вы. Вы там твар у твар непасрэдна з беларускім народам, з працаўнікамі нашымі, асабліва ў сельскай гаспадарцы. І ствараеце гэту аснову для маіх, у тым ліку, кантактаў і перагавораў на самым высокім узроўні.

> **Усё пачынаецца з вас. Таму я заўсёды сустракаюся са старшынямі райвыканкамаў, каб яны разумелі, што гэтыя фігуры, асабліва цяпер знаходзяцца ў цэнтры нашай увагі», — растлумачыў Прэзідэнт.**

І расставіў акцэнты, на якія новым кіраўнікам раёнаў варта звярнуць асаблівую пільную ўвагу.

## ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ. ЗАХАВАННЕ І ПАЛЯПШЭННЕ ТАГО, ШТО ЁСЦЬ

Лідар дзяржавы не сумняваецца, што з гэтым кіраўнікі раёнаў справяцца. «Мы ў дадзеным плане будзем вас вельмі сур'ёзна падштурхоўваць і патрабаваць ад вас, каб гады якасці і добраўпарадкавання былі заўважаныя і перш за ўсё нашым народам. Фармальна да гэтага ставіцца ні ў якім разе нельга», — папярэдзіў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўсе людзі вопытныя і ведаюць, як навесці парадак у аграгарадках, пасёлках гарадскога тыпу і раённых цэнтрах. Тым больш нядаўна гэта пытанне разглядалася на ўзроўні Прэзідэнта. За ўзор развіцця раёнаў варта ўзяць Шклоўскі раён. Аляксандр Лукашэнка параіў паглядзець на тое, як там арганізавана работа будаўнічых арганізацый, райаграсэрвісаў, перапрацоўка, праекты ў рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект». «Усё паказалі і расказалі ад маленькай пякарні да буйнога перапрацоўчага малаказавода. Дзейнічайце, — параіў беларускі лідар. — Тое ж самае Копысь — пасёлак гарадскога тыпу. Я вельмі добра ведаю гэта паселішча, таксама ўсё расказалі і паказалі, як рухацца. І там ужо ёсць пэўныя вынікі. Стандарты ўстаноўлены па аграгарадках і буйных вёсках, цэнтрах тых калгасаў, якія вы далучалі, аб'ядноўвалі. Ад тых жа буйных вёсак, цэнтраў буйных калгасаў нікуды не дзенешся — там жа жывуць людзі, і нямала нашых людзей жыве. Іх таксама трэба прыводзіць у парадак».

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што «неперспектыўных вёсак» быць не павінна. На прыкладзе Мінскага раёна ён адзначыў, што такія вёскі асвойваюцца людзьмі, якія пачынаюць там будаваць дамы на свабодных участках.

> **«Дзейнічайце больш рашуча. Прыводзьце свае тэрыторыі ў парадак. Не крыўдзіце людзей», — настройвае кіраўнік дзяржавы.**

Ён паўтарыў сваё ключавое патрабаванне да кіраўнікоў на месцах — падыходзіць па-гаспадарску. «Я вельмі спадзяюся, што вы ў такім плане будзеце дзейнічаць. Гэта звязана з людзьмі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён заўважыў, што важна і людзей прыцягваць да грамадска-карыснай працы, каб тыя не думалі, што ўлада прыйдзе і ўсё зробіць за іх. «Прымушайце людзей рабіць сваю справу. Што датычыцца нас, мы павінны гэта рабіць і зробім. Як гэта рабіць — я ўжо расказаў і паказаў. Таму дзейнічайце», — настроіў назначэнцаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт папярэдзіў, што «цэнтры цяжару» будуць пераносіцца ў рэгіёны. У краіне паволі сталі адыходзіць ад забудовы Мінска, ад буйных гарадоў, каб не перанасычаць іх людзьмі, інакш узнікае мноства праблем з перанасяленнем, недахопам працоўных месцаў.

У чарговы раз кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: у краіне — Год добраўпарадкавання. І заўважыў, што гэта найперш — здароўе людзей. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што кітайская дэлегацыя была прыемна ўражана беларускай прыродай, чысцінёй і

# НАШУ ПАЛІТЫКУ І ПАЗІЦЫЮ ТАК, І КАМФОРТНА ПРАЦАВАЦЬ»

акуратнасцю. «Гэта трэба захаваць. Захаваць нашым дзецям. Таму добраўпарадкаванне — захаванне таго, што ёсць, і паляпшэнне таго, што ёсць у Беларусі», — адзначыў беларускі лідар.

## КАДРЫ. НАЙМАЙЦЕ ЛЮДЗЕЙ, ЗАКЛЮЧАЙЦЕ ДАГАВОР І ПРАЦУЙЦЕ

Актуальнае і пытанне працоўных рэсурсаў. «Як і ва ўсім свеце, акрамя, можа, некаторых краін Азіі і Афрыкі, у нас дэфіцыт працоўных рэсурсаў. Дзякуй богу, яшчэ не катастрафічны. Але мы не павінны да катастрофы даводзіць, — сказаў Прэзідэнт. — Таму прынятая пастанова аб прыцягненні працоўных рэсурсаў, перш за ўсё з былых рэспублік Савецкага Саюза». Ён звярнуў увагу, што ніхто не агітуе замежнікаў прыязджаць на работу ў Беларусь, яны прыязджаюць па ўласным жаданні.

Днямі кіраўніком дзяржавы быў падпісаны ўказ, які вызначае адказнасць наймальнікаў за замежных работнікаў. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што і кіраўнікі прадпрыемстваў на месцах і кіраўнікі раёнаў павінны быць зацікаўлены ў прыцягненні кадраў. Яны павінны займацца іх падборам.

> **«Калі на нейкім прамысловым прадпрыемстве, папяровай фабрыцы ці яшчэ дзесьці патрэбныя людзі, няхай кіраўнік наймае гэтых людзей, якія прыязджаюць у Беларусь з розных краін. Мы нікога не абмяжоўваем. Наймайце, заключайце з імі дагавор, працуйце», — падкрэсліў лідар дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што мігранты, якія парушаюць дагавор і не выконваюць свае абавязацельствы, будуць выселены з краіны.**
> **Але, арыентуе Прэзідэнт, да тых, хто сюды прыехаў працаваць і зарабляць (таму што на радзіме няма такой магчымасці), асабліва з сем'ямі і дзецьмі, трэба ставіцца як да сваіх беларусаў.**

## СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. КАТАСТРОФЫ НЯМА

Яшчэ адна зона адказнасці кіраўнікоў раёнаў — сельская гаспадарка, сітуацыя з якой сёлета вельмі няпростая. «Замаразкі ў канцы красавіка — пачатку мая сваю брудную справу зрабілі. Але зноў жа, катастрофы няма», — звярнуў увагу беларускі лідар. Як было даложана Прэзідэнту, перасеяць неабходна невялікую колькасць пасеваў, у адносінах да агульных плошчаў. І гэта задача фактычна выкананая. У цэлым праблема вырашана.

Асаблівасць бягучага года — выкарыстанне вялікіх плошчаў пад бульбу. Прычым сёлета гэту культуру пасадзілі нават тыя, хто раней яе не вырошчваў. «Раю гэтым займацца, яшчэ час ёсць. Насенне ёсць. Гэта трэба давесці да ўсіх. Попыт на бульбу будзе каласальным. Таму што на галоўным нашым рынку, у Расіі, вялікая гібель па бульбе. У іх таксама былі сур'ёзныя замаразкі», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён параіў у дастатковай колькасці высейваць цыбулю. І, зразумела, — агароднінныя культуры. «Гэта трэба пасеяць. Будзе добрая цана, і ў нашых суседзяў, і ўнутры краіны. Ёсць добрая магчымасць зарабіць. Таму глядзіце ўважліва, рэкамендуйце, райцеся з нашымі спецыялістамі для таго, каб дасягнуць вынікаў».

## РАБОТА З ЛЮДЗЬМІ. НЕ ПАВІННА БЫЦЬ НАСКОКАЎ

Аляксандр Лукашэнка папрасіў новых кіраўнікоў дзейнічаць акуратна са сваімі падначаленымі. «Не павінна быць ніякіх наскокаў. Гэта не той час, сярэдзіна 1990-х, калі ў нас з вамі пустыя паліцы былі. Многія з вас, маладыя людзі, гэтага не памятаюць. А я памятаю. Тады патрэбныя былі жорсткія імгненныя рашэнні, — нагадаў ён. — Але сёння час іншы. Не трэба наскокам вырашаць дадзеныя пытанні. Трэба акуратна падыходзіць да людзей, гэта нашы людзі».

Кіраўнік дзяржавы настойвае, што кожнаму чалавеку ў краіне трэба знайсці сваё месца. І ў кожнага павінен быць шанц знайсці сябе. Акрамя таго, як падкрэсліў Прэзідэнт, у такі складаны час кожны павінен працаваць інтэнсіўна і актыўна, увесь час «бегчы наперад». І задача кіраўніка — зразумець, дзе чалавек можа прынесці больш за ўсё карысці, і накіраваць яго туды. «Будзьце вельмі акуратныя, не душыце, не цісніце. Але калі бачыце, што чалавек не цягне, — часу ў вас няма. Значыць, тое месца будзе правалена ці вам самім прыйдзецца гэта браць на сябе. А гэта няпроста. Таму будзьце вельмі акуратныя. Паважліва стаўцеся да людзей, не адпіхвайце, не адштурхоўвайце. Ніякага бюракратызму і цяганіны... Чалавек звярнуўся, скажыце яму «так» ці «не», — параіў Прэзідэнт. — Не адштурхоўвайце людзей, трэба дапамагчы — дапамажыце. Не патрэбна дапамагаць — хай самі робяць».

Галоўнае, па словах Аляксандра Лукашэнкі, сумленная і адкрытая палітыка да людзей. Ён адзначыў, што ёсць і «прафесійныя» скаржнікі, якія не прапаноўваюць нічога канструктыўнага або карыснага. Але, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, і з такімі людзьмі трэба працаваць, неабходна знаходзіць да іх падыход. «Гэта наш лёс, ваш лёс. Гэта наша жыццё, калі мы прэтэндуем на кіраўніцтва тым ці іншым рэгіёнам, краінай або вобласцю.

> **Вы — мой твар на месцы, вашы ўсе памылкі праецыруюцца на Прэзідэнта, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

— Правільна ставяць людзі пытанні, я вас прызначаю, я за вас нясу адказнасць. Таму давайце будзем выбудоўваць нашу палітыку і пазіцыю так, каб нам было нармальна і камфортна працаваць. Мне на сваёй пасадзе, вам, як маладым людзям, за якімі будучыня, — на сваёй».

## ЭКАНОМІКА Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Па выніках гэтага кадравага дня новыя кіраўнікі з'явіліся ў пяці раёнах краіны. Старшынёй Полацкага райвыканкама стаў Васіль Шылаў, Верхнядзвінскага — Віталь Лаўрынаў, Мёрскага — Аляксандр Ярахновіч. Шаркаўшчынскі райвыканкам узначаліў Сяргей Кашміла, Чэрыкаўскі — Аляксей Жарнасекаў. Эдуард Тамільчык узначаліў адміністрацыю Кастрычніцкага раёна Мінска.

Алена Пруднікава-Кірпічонак прызначаная намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. Яна будзе курыраваць пытанні эканомікі. «Рэгіён няпросты, ёсць з чым працаваць. Самая галоўная задача — вырашыць праблемы з адтокам кадраў, заработнай платай. Кіраўнік дзяржавы даручыў вырашыць пытанні па добраўпарадкаванні, пабудаваць усё, што мы абяцалі народу ў бягучай пяцігодцы, зрабіць зачын на будучыню, рэалізаваць усе інвестпраекты. Актуальныя пытанні па экспарце, таму што валютная выручка — гэта ў тым ліку і бяспека нашай краіны», — падзялілася яна сваімі планамі з журналістамі.

Максім Гурын узначаліў Бабруйскі гарвыканкам. У размове з журналістамі ён звярнуў увагу, што Бабруйск — буйны прамысловы цэнтр, дзе размешчаны прадпрыемствы, якія маюць вялікую ўдзельную вагу ў вобласці і краіне. «Эканоміка ў аснове. І, вядома, работа з насельніцтвам. Перакананы, што мы прымножым дасягнутыя паказчыкі і зробім усё, каб горад Бабруйск дынамічна развіваўся і рабіў свой унёсак у дабрабыт вобласці і краіны», — падзяліўся Максім Гурын планамі.

# УСЮДЫ ТРЭБА НАПРУЖВАЦЦА

**Кіраўнік дзяржавы правёў кадравыя змены ва ўрадзе, Адміністрацыі Прэзідэнта, Акадэміі навук і міністэрствах.**

## НАВУКА ДЛЯ НАС — НАЙВАЖНЕЙШЫ ЭЛЕМЕНТ

Намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір Каранік прызначаны Старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук. Прэзідэнт, не ў крыўду акадэмікам і Акадэміі навук, адзначыў, што навуку трэба падымаць на больш высокі ўзровень. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што абмяркоўваў гэта з былым кіраўніком НАН Уладзімірам Гусаковым і ён разумее — патрэбны маладыя, перспектыўныя, але ў той жа час вопытныя людзі.

«Уладзімір Сцяпанавіч, з усіх кандыдатаў, якія былі мне прапанаваны, я выбраў вас. І ведаю, што вас добра ўспрымуць навукоўцы. З гэтым трэба лічыцца. Я таксама лічуся. Вы працавалі і членам урада — міністрам. Вы, самае галоўнае, атрымалі добры вопыт і веды, працуючы губернатарам. Да вас людзі вельмі добра ставіліся ў Гродзенскай вобласці, — адзначыў Прэзідэнт. — Навука для нас — найважнейшы элемент. Таму што далей без навукі мы не зможам рухацца проста».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на перагаворах з віцэ-прэм'ерам Дзяржсавета КНР абмяркоўвалася неабходнасць заключэння новых кантрактаў менавіта інавацыйнага характару. Сёння, каб канкурыраваць, патрэбныя інавацыйныя вытворчасці і прадукты. «Нашы навукоўцы многае могуць. Але не заўсёды, дарэчы, ва ўрадзе і губернатары нашы гэта нармальна ўспрымаюць. З вашай падрыхтоўкай, з вашымі ведамі і напорыстасцю ў характары мы многае можам зрабіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама паставіў задачу ўважліва паглядзець на кадры ў Акадэміі навук, на планы развіцця. «Я вельмі разлічваю, што гэтая работа ў вас атрымаецца. І ўпэўнены, што навукоўцы вас успрымуць. Гэта немалаважна», — даў наказ Уладзіміру Караніку кіраўнік дзяржавы.

## САЦЫЯЛЬНЫ БЛОК У НАС, НАПЭЎНА, САМЫ СКЛАДАНЫ

На пасадзе віцэ-прэм'ера Уладзіміра Караніка змяніла Наталля Пяткевіч, якая да цяперашняга часу займала пасаду першага намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Ва ўрадзе яна будзе курыраваць сацыяльны блок пытанняў. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, на дзяржаўнай службе Наталля Пяткевіч чалавек не новы. У розныя гады яна займала кіруючыя пасады ў Адміністрацыі Прэзідэнта і, па словах лідара дзяржавы, работу гэту добра ведае. «Я яе разглядаў раней на пасаду віцэ-прэм'ера, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Тут сацыяльны блок у нас, напэўна, самы складаны. З вашымі падыходамі і дысцыплінаванасцю, патрабавальнасцю, я ўпэўнены, што мы нарэшце зможам вырашыць не толькі пытанні вытворчасці кінафільмаў нармальных. Не разумеем, аказваецца, што нам трэба кіно з усіх ідэалагічных складнікаў. Таму я перакананы, што не толькі кіно, культура, але і спорт, і ахова здароўя вельмі важная, адукацыя».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што беларускі вопыт у ахове здароўя, адукацыі і іншых сферах цікавы афрыканскім краінам, і гэта трэба мець на ўвазе. Ён таксама запатрабаваў больш актыўна дыверсіфіцыраваць экспарт беларускіх прадуктаў харчавання. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер, напрыклад, ёсць цяжкасці з продажам за мяжу масла, існуе лішак гэтага тавару. «А так усё раскупляюць, акрамя масла. Але масла ж з малака. Ну, давайце, як у Ваўкавыску (на прадпрыемстве «Беллакт». — **Заўв. рэд.**), перапрацуем у гэта сухое малако. Добрая цана. Адвязем у Афрыку. Дзіцячае харчаванне зробім, — прапанаваў адзін з варыянтаў дзеяння кіраўнік дзяржавы. — Нам трэба ў гэтых адносінах рухацца наперад і ні ў якім разе не спыняцца. Гэта вельмі важна. Без эканомікі нікуды. Я год таму вас папярэджваў, што ў нас будуць праблемы на асноўным рынку — на расійскім. Яны ўжо з'яўляюцца. Дзякуй богу, Кітай ёсць, які ўсё больш і больш спажывае нашых прадуктаў харчавання і гэтак далей. Але з прамысловых тавараў кітайцы ў нас нічога не купяць. Таму што гэта добра ў іх усё сваё. А на расійскім рынку цяпер шалёная канкурэнцыя. Усё не проста. Таму ўсюды трэба напружвацца і працаваць».

## ТАМ «АБКАТКУ» ДОБРУЮ І ПАДРЫХТОЎКУ ПРАХОДЗЯЦЬ

Пасаду першага намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта заняў **Уладзімір ПЯРЦОЎ**, які да гэтага працаваў на пасадзе намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Звяртаючыся да Кіраўніка Адміністрацыі Дзмітрыя Крутога Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу вызначыцца з абавязкамі намеснікаў да нарады, прысвечанай дзейнасці Адміністрацыі.

***(Заканчэнне. на 4-й стар.)***

# УСЮДЫ ТРЭБА НАПРУЖВАЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ

*(Пачатак на 2–3-й стар.)*

Прэзідэнт не выключае, што пасля пераходу Наталлі Пяткевіч на работу ва ўрад у кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта будзе дадаткова прызначаны яшчэ адзін намеснік. Пакуль гэта пытанне не вырашана.

**«Трэба не забываць, што намеснік Кіраўніка Адміністрацыі — гэта яшчэ кадры на будучыню. Яны там «абкатку» добрую і падрыхтоўку праходзяць. Таму для нас гэта не так затратна — мець там не трох, а чатырох намеснікаў. Паглядзіце разам, абмяркуйце, вы людзі вопытныя, ведаеце, што вам трэба, а што не. Як вы вырашыце, так і будзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Да гэтага моманту памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Вакульчык прызначаны кіраўніком Апарату Савета Міністраў. Як адзначыў Прэзідэнт, гэту пасаду заўсёды займаў чалавек ваенны, падрыхтаваны, чалавек вопытны. «Гэта пасада міністра. Прытым вельмі сур'ёзная — трэба арганізаваць работу апарату ўрада. Гэта вельмі сур'ёзная пасада. З Наталляй Уладзіміраўнай (Пяткевіч. — **Заўв. аўт.**) вы там знойдзеце агульную мову. Як людзі сістэмныя і патрабавальныя, думаю, будзеце да месца цяперашняму ўраду. Прынамсі, Аляксандр Генрыхавіч (Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. — **Заўв. аўт.**) наконт вас не меў ніякіх пярэчанняў. Нават задаволены быў».

Уладзімір Юргевіч прызначаны памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што праблем там нямала. «Я за тваёй працай буду пільна назіраць. І не толькі таму, што я там часта бываю, гэта, можна сказаць, родная зямля. У Віцебскай вобласці шмат праблем», — сказаў Прэзідэнт.

Мікалай Рагашчук прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Грузію. Лідар дзяржавы адзначыў, што адносіны з гэтай краінай зрушыліся ў лепшы бок. «Я вельмі задаволены, што гэта адбылося. Грузіны да нас вельмі добра ставяцца, цэняць наш народ. Ды і ў кіраўніцтва краіны больш-менш нармальныя адносіны. Ды ім у галаву забіваюць, што мы там сапернікі, працўнікі і ледзь не ворагі. Але мы для грузінскага народа ніколі сапернікамі не былі», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларусы за тое, каб усе народы жылі ў згодзе. «Трэба рабіць так, як лепш для людзей. Гэта наша пазіцыя», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

## ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ, ЗБАЛАНСАВАНЫ ПАДЫХОД І ЭКАНОМІКА — ЧЫМ БУДУЦЬ КІРАВАЦЦА НАЗНАЧЭНЦЫ НА НОВЫХ ПАСАДАХ

Пра тое, як будуць выконвацца пастаўленыя Прэзідэнтам задачы і на што будзе зроблены акцэнт, героі кадравага дня расказалі журналістам. **Намеснік Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ** прызналася, што прызначэнне стала для яе нечаканым і назвала гэты этап у кар'еры чэленджам, пэўным выклікам.

**«Сацыяльны блок — гэта самае галоўнае для нашых людзей. У сацыяльна арыентаванай дзяржаве і з улікам тых патрабаванняў, якія агучвае Прэзідэнт па абароне інтарэсаў нашых грамадзян, — гэта, вядома, найважнейшая тэма», — адзначыла яна.**

Па словах Наталлі Пяткевіч, гэта вельмі складаная сфера. У тым ліку і таму, што грамадзяне імкнуцца да больш высокага ўзроўню жыцця і ў іх адпаведныя чаканні ад улады. Рэалізацыя задуманага, вядома, патрабуе ўкаранення інавацый, а значыць, і вялікіх выдаткаў. Ёсць і аб'ектыўныя тэндэнцыі, напрыклад, у ахове здароўя — гэта старэнне насельніцтва, павелічэнне працягласці жыцця, запатрабаванасць медыцынскіх паслуг. Узнікаюць і праблемы, сярод якіх недахоп кадраў, павелічэнне фінансавання і іншыя. «Таму ў частцы аховы здароўя трэба будзе ўсё скамбінаваць: і патрабаванні Прэзідэнта, і аб'ектыўныя ўмовы, і ўсе напрацоўкі, каб ахова здароўя ў нашай краіне, як заўсёды, была на вельмі высокім узроўні», — сказала намеснік Прэм'ер-міністра.

Наталля Пяткевіч адзначыла, што ёсць пэўныя прэтэнзіі да сферы культуры, асабліва на кантрасце з іншымі краінамі. «Нашай краіне трэба адпавядаць, — падкрэсліла віцэ-прэм'ер. — Мы — спартыўная дзяржава. І таму не толькі глядзець, а дасягаць высокіх вынікаў, развіваць фізічную культуру, спорт».

Наталля Пяткевіч зрабіла акцэнт на тым, што ўсё гэта трэба ўмясціць у тыя эканамічныя рэаліі, якія ёсць і ў свеце, і ў нашай краіне. «Самае галоўнае патрабаванне — павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання ў цэлым, у тым ліку ў сацыяльным блоку», — рэзюмавала яна.

**Старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір КАРАНІК** падкрэсліў, што ў сучасным свеце вельмі цяжка пераацаніць значэнне навукі. А ў нашай краіне навука заўсёды знаходзілася ў зоне пільнай увагі. Калі паглядзець на адносіны фінансавання навукі да ВУП, Беларусь у СНД займае другое месца. «Паводле стратэгіі нацыянальнага развіцця, плануецца істотнае павелічэнне фінансавання навуковых даследаванняў. Цяпер стаіць задача забяспечыць найбольш эфектыўнае, рацыянальнае выкарыстанне сродкаў», — адзначыў Уладзімір Каранік.

Па яго словах, асаблівую ўвагу трэба накіраваць на падрыхтоўку навуковых кадраў. Па словах кіраўніка НАН, будучых даследчыкаў неабходна шукаць яшчэ ў школе. Не менш важна развіваць навуку ў ВНУ, каб прывіць цікавасць да навуковых даследаванняў і ацаніць здольнасці маладых людзей. «Вядома, гэта падтрымка маладых навукоўцаў, вывучэнне магчымасцяў выдзялення грантаў. Гэта венчурнае фінансаванне для рызыкоўных праектаў — тыя новыя формы, якія трэба ўводзіць у практыку работы Акадэміі навук, — падкрэсліў Уладзімір Каранік. — Пры гэтым мы павінны вельмі беражліва захоўваць той трывалы падмурак, створаны папярэднімі пакаленнямі (акадэмічная навука, фундаментальныя даследаванні). Але і дакладна вызначыць прыярытэты, дзе ў нас ёсць кампетэнцыі, каб развівацца далей і заставацца канкурэнтаздольнымі, і дзе ў нас ёсць вострая патрэба рэальнага сектара эканомікі». Старшыня НАН заўважыў, што на старым багажы без істотных змен адно пакаленне яшчэ пройдзе, але для пераходу эканомікі і краіны ў цэлым на новы тэхналагічны ўклад, неабходна істотная актывізацыя навуковай дзейнасці і развіццё новых кірункаў, якія да гэтага, можа, знаходзіліся ў цені.

Уладзімір Каранік удакладніў, што гаворка ідзе не пра рэвалюцыйны, а эвалюцыйны шлях з захаваннем тых школ, што ёсць. «Баланс можа забяспечыць больш цеснае ўзаемадзеянне паміж практыкай і навукай. Прыкладных даследаванняў без фундаментальных не бывае. Але і чыста фундаментальныя даследаванні, якія потым не знаходзяць свайго працягу ў тым, што запатрабавана эканомікай, для дзяржавы неапраўданыя. Задача — збалансаваны падыход», — рэзюмаваў ён.


Фота БелТА.

Першым крокам у развіцці адносін Беларусі і Грузіі **пасол Юрый РАГАШЧУК** назваў развіццё гандлёва-эканамічных адносін, павелічэнне таваразвароту, пастаўкі нашых тавараў на грузінскі рынак. «Беларусь і Грузія маюць добрыя сувязі на ўзроўні рэгіёнаў, і гэта ўзаемадзеянне трэба ўмацоўваць. Усё пачынаецца з нізоў. Варта арганізоўваць супрацоўніцтва нашых рэгіёнаў з рэгіёнамі Грузіі. І яшчэ адно пытанне. З грузінскага боку ёсць запыт (з нашым бізнесам мы размаўлялі) на стварэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва. Бізнес заўсёды хутчэй дамовіцца, чым чыноўнікі. Мы паспрыяем таму, каб гэты савет быў створаны. Гэта ўсё будзе ўплываць на экспарт нашых тавараў у Грузію», — расказаў пасол.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Прэзідэнт таксама прызначыў **Андрэя КАРТУНА** і **Дзяніса СКАБЯЛКА** намеснікамі Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка. **Мікалай ШАРСНЁЎ** прызначаны намеснікам Кіраўніка справ Прэзідэнта. **Юрый АМБРАЗЕВІЧ** прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь пры Суверэнным Ваенным Ордэне Гаспітальераў Святога Іаана Іерусалімскага, Родаса і Мальты, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацыях у Рыме, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры ЮНЕСКА па сумяшчальніцтве.

Кіраўнік дзяржавы даў згоду на прызначэнне **Алега ПАНАСЮКА** генеральным дырэктарам ААТ «Керамін», **Ігара ЯЦКЕВІЧА** — рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі. Па выніках кадравага дня **Святлана КАРАТКЕВІЧ** — намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю; **Андрэй КАРАСЬ** — першы намеснік міністра лясной гаспадаркі, Ігар Малашэвіч — намеснік кіраўніка Мінлясгаса. **Уладзіслаў ДОЎГІ** і **Канстанцін АНОШАНКА** — намеснікі міністра энергетыкі. Прэзідэнт узгадніў прызначэнне **Вадзіма ШАПЯЛЕВІЧА** кіраўніком Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

У тэму

## Турчын – аб кадравых зменах ва ўрадзе: «З такім калектывам нам усе задачы па плячы»

Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын учора прадставіў новых віцэ-прэм'ера і кіраўніка апарата Савета Міністраў калектыву апарата і профільным міністрам.

Аляксандр Турчын, характарызуючы прафесійныя якасці Наталлі Пяткевіч, падкрэсліў:

— Чалавек, які доўгі час працуе ў сістэме дзяржкіравання, шмат добрага і карыснага зрабіў для нашай краіны. Зразумела, што вельмі складаны ўчастак работы: блок сацыяльнай сферы — гэта найбольш адказны і важны блок у любым дзяржаўным органе.

Па словах Аляксандра Турчына, ахова здароўя, адукацыя, культура, спорт, сацыяльная абарона — тыя сферы, з якімі грамадзяне сутыкаюцца кожны дзень.

Гаворачы пра новага кіраўніка апарату Саўміна Валерыя Вакульчыка, Прэм'ер-міністр адзначыў яго якасці: «вопытны, дасведчаны, прыстойны чалавек».

Падсумоўваючы, Аляксандр Турчын падкрэсліў:

— З такім калектывам нам усе задачы па плячы.

ВА ЎРАДЗЕ

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І РОСТ

## Прамысловасць — у фокусе ўвагі ўрада

Учора на нарадзе ў Прэм'ер-міністра Аляксандра ТУРЧЫНА былі абмеркаваны інструменты павышэння эфектыўнасці прамысловых прадпрыемстваў, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

У ліку прыярытэтаў: пошук рашэнняў па павелічэнні экспарту; зніжэнне ўнутраных выдаткаў; рост прадукцыйнасці працы.

— Рэалізацыя гэтых рашэнняў дасць магчымасць умацаваць канкурэнтныя пазіцыі прамысловых прадпрыемстваў і забяспечыць устойлівае развіццё прамысловасці ў цэлым, — падкрэслілі ва ўрадзе.

Як расказаў **профільны міністр Аляксандр ЯФІМАЎ**, штогод прамысловасць краіны дэманстравала ўстойлівы і ўпэўнены рост:

— У 2024 годзе, па сутнасці, былі падвоены аб'ёмы вытворчасці і экспарту да 2020-га. Разам з тым, мы разумеем, што знешняя сітуацыя на сёння для нас складваецца не зусім спрыяльна. Гэта неаднаразова, пачынаючы з канца мінулага года, падкрэсліваў кіраўнік дзяржавы. Разумеючы складанасць знешніх фактараў, сёння трэба прымаць пэўныя меры, якія дазволяць захаваць тэмпы, паказаныя ў папярэднія перыяды.

Ён растлумачыў, што на нарадзе ў Прэм'ер-міністра ўдзельнікі падрабязна абмеркавалі галіны прамысловасці і меры падтрымкі, якія неабходна прыняць на ўзроўні ўрада:

— Пасля прапрацоўкі і аказання вышэйназваных мер падтрымкі нашы прадпрыемствы змогуць нават у няпростых умовах прадоўжыць дэманстраваць устойлівае развіццё і ўстойлівы рост аб'ёмаў вытворчасці і экспарту. І важнае для нас — рабіць гэта без спынення інвестыцыйнай і навукова-тэхнічнай дзейнасці.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ВЫВУЧЫЦЬ АСАБЛІВАСЦІ РАБОТЫ НА МЕСЦЫ

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў здзейсніў рабочую паездку ў Віцебскую вобласць

Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый і дзяржаўных органаў Браслаўскага раёна для вывучэння асаблівасцяў функцыянавання падобных устаноў.



Фота ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.

Цэнтр забяспечвае дзейнасць 41 бюджэтнай арганізацыі і дзяржаўных органаў Браслаўскага раёна. Спецыялісты ўстановы (57 чалавек) аказваюць фінансавую і тэхнічную падтрымку бюджэтным арганізацыям: займаюцца бухгалтарскім улікам, фінансавай справаздачнасцю, абслугоўваннем дзяржаўнай маёмасці, закупкамі і іншымі задачамі, якія дапамагаюць вышэйзгаданым установам функцыянаваць.

У час размовы з дырэктарам цэнтра Ігар Сергяенка падрабязна распытаў яго аб умовах працы, загружанасці супрацоўнікаў, іх заработнай плаце. Спікера цікавіла, наколькі прыжылася такая форма, як цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый, што існуе ў краіне каля пяці гадоў, і што неабходна зрабіць для таго, каб функцыянаванне ўстановы было яшчэ больш эфектыўным.

Як растлумачыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, на гэтым тыдні дэпутаты, працуючы ў выбарчых акругах, таксама займаюцца вывучэннем работы падобных цэнтраў у сваіх рэгіёнах. Сабраная парламентарыямі інфармацыя будзе абагульнена для выпрацоўкі прапаноў па ўдасканаленні работы такіх устаноў. У цэлым, па ацэнцы Ігара Сергяенкі, стварэнне такіх цэнтраў апраўдана, аднак існуюць і пэўныя праблемы.

Падчас наведвання цэнтра перадалі ў распараджэнне грузавы ізатэрмічны аўтамабіль для дастаўкі прадуктаў, які быў вельмі неабходны для раёна.

Таксама падчас рабочага візіту Ігар Сергяенка правёў асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Браслаўскім раённым выканаўчым камітэце. Са сваімі пытаннямі да Старшыні Палаты прадстаўнікоў звярнуліся жыхары Браслаўскага і Пастаўскага раёнаў. Тэматыка зваротаў — як заўжды самая розная: ад ДТЗ і ўзаконьвання пабудоў да мадэрнізацыі электрасетак.

На ўсе пытанні былі дадзены дакладныя адказы, а тыя, якія патрабуюць дадатковага разбіральніцтва ўзяты Старшынёй Палаты прадстаўнікоў на кантроль.

Таксама Ігар Сергяенка незапланавана зайшоў у рэдакцыю раённай газеты «Браслаўская звязда». У час размовы з калектывам гаворка ішла аб павышэнні эфектыўнасці работы выдання, больш якасным інфармаванні жыхароў раёна аб найважнейшых падзеях, якія адбываюцца як у рэгіёне, так і ў краіне.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

# «ЭКАНОМІКА — ПАДМУРАК СУПРАЦОЎНІЦТВА»

## Беларуска-кубінскія адносіны абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў

Ігар СЕРГЯЕНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Куба Сант'яга Перэсам БЕНІТЭСАМ.

Падчас мерапрыемства Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што спектр беларуска-кубінскага супрацоўніцтва даволі шырокі, а сустрэчы парламентарыяў Беларусі і Кубы заўсёды праходзяць у атмасферы дружбы і ўзаемаразумення.

«У нас адзіныя падыходы да захавання гістарычнай памяці. Да таго ж нашы пазіцыі па міжнародных пытаннях супадаюць. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў неаднаразова прымалі заявы ў падтрымку Кубы, супраць яе блакады. У вас таксама была магчымасць выступіць з трыбуны Палаты прадстаўнікоў, што з цікавасцю ўспрынята маімі калегамі.

Я ведаю, што 13 мая адбылася ваша сустрэча з Маладзёжным саветам пры Палаце прадстаўнікоў. Абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва моладзі двух краін, прагучалі ініцыятывы», — зазначыў спікер.

Таксама Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу на неабходнасці нарошчвання аб'ёмаў гандлю і з'яўленні новых тэм для ўзаемадзеяння: «Безумоўна, падмурак беларуска-кубінскага супрацоўніцтва — гандлёва-эканамічныя адносіны. Менавіта дадзенай сферы прысвечана пасяджэнне беларуска-кубінскай сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якая гэтымі днямі праходзіць на Кубе».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў упэўненасць, што пытанні, якія абмяркоўваюцца на мерапрыемстве, нададуць імпульс як развіццю новых, так і нарошчванню існуючых сувязяў па традыцыйных кірунках, тым больш што спектр узаемадзеяння даволі шырокі.

У сваю чаргу кубінскі дыпламат адзначыў, што да Беларусі на Кубе ставяцца з вялікай павагай і любоўю. Ён падкрэсліў: «Беларусь — гэта мадэль для вельмі многіх краін».

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў і sb.by**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении.**
**Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9564-7 | 7 703,76 |
| 2 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9575-7 | 7 703,76 |
| 3 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8108-7 | 7 703,76 |
| 4 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8110-7 | 7 703,76 |
| 5 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294595, 2011 г. в., рег. знак АР 8122-7 | 7 703,76 |
| 6 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-02, 2011 г. в., рег. знак АР 8123-7 | 11 063,76 |
| 7 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8131-7 | 9 683,76 |
| 8 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591, 2011 г. в., рег. знак АР 8121-7 | 6 323,76 |
| 9 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8109-7 | 7 703,76 |
| 10 | FORD TRANSIT CONNECT VAN INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8118-7 | 9 683,76 |
| 11 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9601-7 | 9 683,76 |
| 12 | FORD TRANSIT INDEEC 29459101, 2011 г. в., рег. знак АР 8143-7 | 7 703,76 |
| 13 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8126-7 | 7 703,76 |
| 14 | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9563-7 | 6 323,76 |
| 15 | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8142-7 | 11 063,76 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–8 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 05.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.06.2025 до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Полиграфкомбинат им. Я. Коласа»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 05.06.2024.**

**Лот № 1.** Изолированное помещение № 1 с инв. № 443/D-13019.

Начальная цена с НДС 20 % – 535 680 руб.

Изолированное помещение № 1 находится в капитальном строении с инв. № 443/С-17890, которое находится на земельном участке с кадастровым № 425650100001000488. Площадь – 0,0407 га.
**Обременения:** Аренда.
**Местонахождение:** Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Советская, 3-1.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **03.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

23 мая 2025 г. ЗВЯЗДА

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации № 91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Полуприцеп-платформа MAZ 5247 d,**
№ кузова 9011, р/з 6793 АА-7, 1990 г. в., инв. № 60061, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17 (производственная территория).
**Начальная цена лота с НДС 20 % – 22 860,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 26.04.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются: по 03.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению **ОАО «Агрокомбинат «Дзержинский» филиал «Минский»** (продавец, местонахождение: 223043, Минская область, Минский район, п/о Большевик), проводит открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ,**
**расположенных по адресу: Минский р-н, п/о Большевик:**

**Лот № 1. Комбайн зерноуборочный КЗС-1218-10 «ПАЛЕССЕ GS12», 2011 г. в., регистрационный знак ОМ-5 3703, заводской № 05217, инв. № по бух. учету 1716$. Начальная цена с НДС (20 %) – 37 560,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 3 756,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Комбайн зерноуборочный КЗС-1218-10 «ПАЛЕССЕ GS12», 2011 г. в., регистрационный знак ОМ-5 3154, заводской № 04202, инв. № по бух. учету 6405. Начальная цена с НДС (20 %) – 37 560,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 3 756,00 бел. руб.**

**Лот № 3. Комбайн зерноуборочный КЗС-1218-10 «ПАЛЕССЕ GS12», 2011 г. в., регистрационный знак ОМ-5 3701, заводской № 05221, инв. № по бух. учету 1714$. Начальная цена с НДС (20 %) – 31 200,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 3 120,00 бел. руб.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **26.06.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.06.2025** до **17.00**.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 116 45 00.**

УНП 601088545

**Суд Волковысского района Гродненской области** в связи с поступившим заявлением о признании безвестно отсутствующим ХАРЛАМОВА Дмитрия Владимировича, дата рождения: 07.08.1982, уроженца г. Волковыска Гродненской области, последнее известное место жительства которого г. Волковыск ул. К. Цеткин, 3 Гродненской области, просит всех лиц сообщить в течение двух месяцев в адрес суда имеющиеся о нем сведения.

НА СЛЫХУ

# «НАШЫ КАДРЫ — НАША АДКАЗНАСЦЬ»

## Як на «Магілёўскім ДБК» вядзецца работа з працоўнымі мігрантамі




Днямі Аляксандр Лукашэнка падпісаў дакумент, які прынцыпова мяняе структуру ўзаемаадносін паміж наймальнікамі і замежнымі работнікамі. Указ «Аб павышэнні ролі наймальнікаў у галіне знешняй працоўнай міграцыі» ўзмацняе адказнасць наймальнікаў за замежных работнікаў. Вывучэнне ўмоў пражывання, тэставанне на веданне адной з дзяржаўных моў, своечасовае заключэнне працоўнага дагавора, кантроль за дзейнасцю і ўмовамі знаходжання мігрантаў — гэта толькі частка абавязкаў, якія ўскладзены на наймальнікаў, якія запрашаюць замежнікаў на работу. Актуальнасць новага дакумента звязана з тым, што апошнім часам істотна павялічылася колькасць замежнікаў, якія прыбываюць у Беларусь з мэтай працаўладкавацца. Указ грунтуецца на станоўчым вопыце буйных наймальнікаў.

А гэта значыць, што распрацоўшчыкі дакумента доўга збіралі і вывучалі інфармацыю пра тое, як наладзіць узаемаадносіны так, каб гэта было выгадна для абодвух бакоў.

Мы паглядзелі, як будуецца ўзаемадзеянне і якія ўмовы ствараюцца для працоўных мігрантаў на ААТ «Магілёўскі домабудаўнічы камбінат».

### МАГЧЫМАСЦЬ ЗАРАБІЦЬ

Як расказаў журналістам **намеснік дырэктара па прамысловай вытворчасці Мікалай ЯНКОЎ**, на працягу чатырох месяцаў на «Магілёўскім ДБК» працуюць больш за 30 грамадзян Туркменістана. Яны былі працаўладкаваны ў якасці падсобных рабочых з магчымасцю наступнага навучання.

На сёння ў фармовачным цэху № 1 працуе 19 грамадзян Туркменістана, з іх трое ўжо атрымалі кваліфікацыю па прафесіі «Фармоўшчык жалезабетонных канструкцый» другога разраду. Акрамя гэтага, працуюць грамадзяне іншай дзяржавы і на будаўнічых аб'ектах.

«Усе былі забяспечаны жыллём: ёсць ведамасныя кватэры, прадастаўлены інтэрнат. Вядуцца работы па ажыццяўленні кантролю за іх сацыялізацыяй, за ўмовамі іх пражывання. За імі замацаваны інжынерна-тэхнічныя работнікі ў цэхах, дзе яны працуюць, раз на тыдзень праводзіцца аб'езд іх месцаў жыхарства на прадмет сацыяльна-бытавых умоў, на выпадак, калі ім патрэбна якая-небудзь дапамога. Стараемся разам пераадольваць бар'еры і цяжкасці, якія ўзнікаюць», — растлумачыў ён.

Калектыў новых работнікаў прыняў добразычліва. Як адзначыў Мікалай Янкоў, уваход дзвюх дзяржаў у склад СССР спрыяў таму, што многія прыезджыя ведаюць рускую мову. «А тыя, хто не ведае мову, таксама сацыялізуюцца досыць хутка. З ліку тых, хто да нас прыехаў, базавыя веды рускай мовы могуць прымяняць ужо ўсе», — сказаў ён.

> **Такая працоўная міграцыя вырашае адразу некалькі важных пытанняў. Для прадпрыемства — гэта кадры, якія заўсёды патрэбныя будаўнічай галіне. А для прыезджых — выдатная магчымасць, у першую чаргу, зарабіць. А таму ёсць у іх і жаданне асвоіць новую спецыяльнасць.**

Для гэтага на «Магілёўскім ДБК» створаны ўсе ўмовы — асновы прафесіі ад вопытных калег атрымліваюць непасрэдна на працоўным месцы, а тэорыю, напрыклад, па ахове працы або прамысловай бяспецы, вывучаюць у спецыяльным навучальным цэнтры на базе прадпрыемства.

«У першую чаргу людзі едуць таму, што мы можам даць гарантыі працаўладкавання, сацыяльнага пражывання: добрыя ўмовы для жыцця, забеспячэнне ўсім неабходным — ад пасцельнай бялізны да пральнай машынкі. Гэта значыць, мы цалкам ствараем ім сацыяльна-бытавыя ўмовы і, самае галоўнае, даём магчымасць зарабіць».

### ДАПАМОГА Ў САЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Такая ўвага да прыезджых грамадзян іншай дзяржавы, кажа **намеснік дырэктара па быце, ідэалагічнай рабоце Валянціна РУБАН**, дапамагае ім адаптавацца да жыцця ў новых для іх умовах, а яшчэ — гэта гарантыя бяспекі і выканання законаў нашай краіны. «Мы не толькі глядзім умовы жыцця, але і дапамагаем вырашаць нейкія, на першы погляд, бытавыя пытанні: дзе і што можна купіць, у якой краме зручней і танней, дзе знаходзіцца прыпынак грамадскага транспарту, як дабрацца да патрэбнага месца», — расказала яна.

За мінулыя чатыры месяцы толькі два работнікі вярнуліся на радзіму па сямейных абставінах.

«Цяпер грамадзяне Туркменістана знаходзяцца ў нас па спецдазволе. Таксама мы чакаем без спецдазволу грамадзян Туркменістана, якія прыедуць да нас працаваць па сваёй прафесіі: маляры, тынкоўшчыкі, электрагазазваршчыкі, — кажа суразмоўніца. — У нас на сёння ўжо больш за 30 чалавек працуюць, яшчэ на 20 работнікаў мы падалі дакументы для атрымання спецдазволу для працаўладкавання. І дадаткова яшчэ 15 чалавек — праз пасольства чакаем па наяўных у гэтых людзей прафесіях».

### ЯК ПРАЦУЕШ, ТАК І ЗАРАБЛЯЕШ

Сярод тых, хто прыехаў з Туркменістана для работы на «Магілёўскім ДБК», — **Нурмамет Назараў**. На радзіме засталіся жонка і дзве дачкі. Рашэнне аб працаўладкаванні тут мужчына прыняў па некалькіх прычынах. «Беларусь — краіна мірная, добраўпарадкаваная, людзі тут чалавечныя. Нам тут добра, — дзеліцца ён. — А яшчэ — выдатныя ўмовы працы і пражывання, адносіны людзей да нас. Беларусы ветлівыя — ад граніцы да любога горада. Тут у калектыве працаваць камфортна, усе адно аднаго разумеюць, дапамагаюць асвоіцца: і ў працоўных момантах, і ў нейкіх жыццёвых пытаннях».

Пра магчымасць атрымаць працу ў Магілёве Нурмамет Назараў даведаўся ў агенцтве па працаўладкаванні. «У нас ёсць такое агенцтва, вось мне там і прапанавалі паехаць сюды працаваць. Распавялі пра ўмовы, аб'ём работы, заробак. Я пагадзіўся. Як кажуць, нам толькі работу дай, — усміхаецца мужчына. — Заработная плата тут добрая — як працуеш, так і атрымліваеш. Жыллё далі, за што вялікі дзякуй кіраўніцтву».

Цяпер мужчына працуе падсобным рабочым, але падаў заяву на атрыманне прафесіі фармоўшчыка жалезабетонных канструкцый. «У нас дваіх ужо перавялі на фармоўшчыкаў. Таксама чакаю свой сертыфікат. Бо гэта іншыя аб'ёмы работы, а значыць, і заробак стане вышэйшым», — кажа ён.

Атрыманая ў сценах магілёўскага прадпрыемства прафесія — універсальная, адзначыў Нурмамет Назараў. У выпадку вяртання на радзіму тыя, у каго да гэтага не было спецыяльнасці, змогуць знайсці ўжо больш аплатную работу па атрыманым у Беларусі профілі.

**Па матэрыялах БелТА.**

# ЛЕТА ЗАБРАНІРАВАНА



## СЯРЭДНІ КОШТ — 140 РУБЛЁЎ ЗА СУТКІ

На працягу апошніх гадоў адчуваецца ўстойлівы попыт на санаторна-аздараўленчыя віды паслуг. Здраўніцы працуюць на перспектыву, штогод укладваючы сродкі ў развіццё, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Як паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ,** інвестыцыі павялічваюцца не менш як у паўтара раза ў параўнанні з папярэднім годам.

Паводле яго слоў, пуцёўкі на лета ўжо забраніраваны. Засталіся адзінкавыя нумары, у якія яшчэ можна засяліцца, — дзе не пацвярджаецца бронь. Плануецца, што ў летні перыяд запаўняльнасць санаторыяў будзе на ўзроўні 100 %, а колькасць тых, хто пройдзе лячэнне і аздараўленне ў такіх установах, перасягне 600 тысяч чалавек. Пры гэтым сярэдні кошт летам складзе 140 рублёў за суткі на аднаго чалавека.

Напрыклад, санаторый «Сосны» ў мінулым годзе на ўдасканаленне інфраструктуры накіраваў звыш 36 мільёнаў рублёў. Пабудаваны новы корпус з больш чым шасцю дзясяткамі нумароў, рэстаранна-забаўляльны комплекс. Дадаткова добраўпарадкавана тэрыторыя, абсталявана варкаўт-пляцоўка.

— Некаторыя віды працэдур падказваюць нам нашы наведвальнікі. Апошнім часам пыталіся пра ReOxy-тэрапію — мы прыслухаліся і закупілі новае абсталяванне, — гаворыць **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы санаторыя «Прыазёрны» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Галіна ЦІХАНОВІЧ,** дадаючы, што тут працуе самы вялікі на ўзбярэжжы возера Нарач СПА-комплекс, дзе прапануюцца дзясяткі працэдур і методык.

## ГОСЦІ З 67 КРАІН

Як адзначыў Генадзь Балбатоўскі, меры, якія прымаюцца, даюць вынік. Адпачынак запатрабаваны як у беларусаў, так і ў замежнікаў. Па выніках I квартала запаўняльнасць санаторна-курортнага комплексу павялічылася больш як на 5 % у параўнанні з I кварталам мінулага года і перасягнула ў сярэднім 78 %. Прычым больш чым на 17 % узраслі продажы пуцёвак менавіта ў свабоднай рэалізацыі.

— Выручка ад свабоднай рэалізацыі перасягнула 217 мільёнаў рублёў. Адзначалася павелічэнне попыту і сярод замежных грамадзян. Сёлета рост у I квартале ў параўнанні з адпаведным перыядам 2024-га — 15 %, — кажа ён. — Сёння комплекс не толькі стабільна функцыянуе, але і дынамічна развіваецца.

Геаграфія адпачывальнікаў шырокая — на аздараўленне ў Беларусь прыязджаюць прадстаўнікі звыш 60 краін.



— У нас вялікі попыт з боку расійскіх гасцей, іх больш за 64 %. Прыязджаюць як з Масквы і Санкт-Пецярбурга, так і з Мурманска, Краснаярска, Іркуцка. Таму, каб задаволіць попыт, вырашана пабудаваць новы корпус, адышоўшы ад старога фармату. Мы пабудавалі у лесе атэль, інтэграваны ў сістэму санаторыя, — расказвае **дырэктар санаторыя «Сосны» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Аляксандр ГЕРАСІМОВІЧ.**

У санаторыі «Прыазёрны» ў развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўклалі звыш 7 мільёнаў рублёў. Для адпачывальнікаў адкрыў дзверы аб'ект грамадскага харчавання, размешчаны ў пляжна-паркавай зоне, праведзена рэканструкцыя нумарнога фонду. Закупляецца сучаснае медыцынскае, тэхналагічнае абсталяванне.

Летась санаторыі прымалі гасцей з 67 дзяржаў — пераважна з Еўропы.

— Беларускія санаторыі сёння — шматфункцыянальныя комплексы, дзе, акрамя лячэння, прапануецца шырокі комплекс паслуг. Толькі летась укаранёны 83 новыя медыцынскія праграмы і больш за 150 новых СПА-працэдур, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі, падкрэсліўшы высокі працэнт паўторных наведванняў. — У 60 % выпадкаў людзі вяртаюцца. На мой погляд, гэта самы галоўны крытэрый эфектыўнасці работы.

## РОЎНЫЯ ЦЭНЫ

У найбліжэйшы час адзіныя цэны хочуць укараніць ва ўсіх санаторыях краіны — прынамсі, для грамадзян Саюзнай дзяржавы, каб беларусы і расіяне валодалі роўнымі правамі. Пакуль адзіны падыход пры фарміраванні цэн для ўсіх катэгорый грамадзян прымяняюць больш за 80 % беларускіх санаторыяў. Гэта пытанне вынесена на пасяджэнне Групы высокага ўзроўню Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе 28 мая ў Смаленску.

Трэба сказаць, што ў рамках праграмы Саюзнай дзяржавы на 2025 год запланавана аздараўленне больш як паўтысячы беларускіх дзяцей у санаторыях Расіі і Беларусі. Пашырылася і супрацоўніцтва па праграме Саюзнай дзяржавы. У прыватнасці, летась з'явілася новая катэгорыя, якая мае права на аздараўленне, — удзельнікі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Раней грамадзяне Расіі мелі магчымасць атрымліваць лячэнне за кошт сродкаў Саюзнай дзяржавы, а грамадзяне, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, — не. Аднак ужо другі год менавіта гэта катэгорыя аздараўляецца за кошт сродкаў Саюзнай дзяржавы. Летась каля 100 чалавек прайшлі аздараўленне ў санаторна-курортных установах Расіі і Беларусі. Сёлета гэта практыка будзе працягнута.

У сістэме Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта функцыянуе сем санаторных арганізацый, з іх чатыры — на тэрыторыі Беларусі, тры — у Расіі (у Сочы, Туапсэ і побач з Ялтай). Адначасова ўсе яны могуць размясціць звыш трох тысяч чалавек. Як паведаміла **загадчык сектара каардынацыі дзейнасці арганізацый аховы здароўя Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Маргарыта ЛЕЎЧАНКА,** летась у іх адпачыла каля 115 тысяч чалавек, за першы квартал гэтага года — больш за 26 тысяч. Прыкладна палова адпачывальнікаў — расіяне. Санаторыі ў Расіі могуць размясціць звыш тысячы чалавек. Усе яны рэалізоўваюць пуцёўкі як праз Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, так і ў свабодным продажы. Санаторыі прымаюць як дарослых, так і арганізаваныя групы дзяцей з рэгіёнаў, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, а таксама дарослых з дзецьмі.

**Алена КРАВЕЦ,**
**фота аўтара.**



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Учреждение образования
«Белорусская государственная академия авиации»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА**

**на замещение вакантных должностей педагогических работников, относящихся к профессорско-преподавательскому составу, по кафедрам:**

**1. Заведующий кафедрой,** кафедра естественнонаучных и общепрофессиональных дисциплин.

**2. Заведующий кафедрой,** кафедра технической эксплуатации авиационного и радиоэлектронного оборудования.

В конкурсе могут принять участие лица, имеющие высшее образование, ученую степень доктора или кандидата наук, наличие научных трудов или изобретений, патентов, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, соответствующий направлению образования кафедры, не менее 7 лет.

**3. Профессор,** кафедра социально-гуманитарных дисциплин.

**4. Профессор,** кафедра технической эксплуатации воздушных судов и двигателей.

В конкурсе могут принять участие лица, имеющие высшее образование, ученую степень доктора или кандидата наук, наличие научных трудов или изобретений, патентов, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, соответствующий направлению образования кафедры не менее 7 лет.

**5. Доцент,** кафедра технической эксплуатации авиационного и радиоэлектронного оборудования.

В конкурсе могут принять участие лица, имеющие высшее образование, ученую степень доктора или кандидата наук, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, соответствующий направлению образования кафедры, не менее 5 лет.

**6. Старший преподаватель,** кафедра естественнонаучных и общепрофессиональных дисциплин.

**7. Старший преподаватель,** кафедра организации движения и обеспечения безопасности на воздушном транспорте.

**8. Старший преподаватель,** кафедра технической эксплуатации авиационного и радиоэлектронного оборудования.

В конкурсе могут принять участие лица, имеющие высшее образование и наличие степени магистра (высшее образование и наличие научной квалификации «Исследователь», высшее образование и наличие ученой степени), стаж работы в должностях педагогических, научных работников не менее 3 лет либо высшее образование и стаж работы в должностях служащих, относящихся к категории «Руководители» или «Специалисты», работа которых соответствует направлению образования, не менее 5 лет.

**9. Преподаватель,** кафедра социально-гуманитарных дисциплин.

В конкурсе могут принять участие лица, имеющие высшее образование, соответствующее педагогической деятельности или высшее образование, соответствующее учебному предмету (учебной дисциплине), и переподготовка по профилям «Педагогика», «Педагогика. Профессиональное образование» без предъявления требований к стажу работы.

Срок подачи документов –
**30 дней со дня опубликования объявления.**

Документы предоставлять в отдел кадров по адресу:
**220096, г. Минск, ул. Уборевича, 77.**

Телефон для справок **358-46-55.**

УНП 100005688

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00112** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Минскому району. 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, 90, тел. 8 017 3592000.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 06.06.2025 в 9.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Автомобиль GEELY SC7, 2014 г. в., рег. номер 9433 НК-7 (Выданы регистрационные знаки для транспортных средств временно допущенных к участию в дорожном движении 5НЕТ4000), тип – легковой автомобиль седан (sedan), кузов (рама) № Y4K8844S4EB001715 цвет – черный, пробег – 130292 км, инв. № 01510008.

**Местонахождение имущества**: г. Минск, ул. Притыцкого, 90.
**Начальная цена:** 3051,61 бел. руб. без НДС.
**Задаток:** 305,16 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 05.06.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: 8 017 359 18 34 – Нетрусова Елена Валерьевна.

**ООО «СпецРеализация»**
объявляет об отказе от проведения открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ОДО «ОРБИУС» (УНП 101258669), назначенных на 04.06.2025, время: 11.00. (РИУ «Издательский дом «Звязда», № 85 (30473) за 03.05.2025).

Утерянный страховой полис «Универсальный страховой полис ОМС иностранных граждан» БВ № 3498721 в представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

УНН 100122726

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Красносельский торг», 231911, Гродненская область, Волковысский район, г. п. Красносельский, ул. Короткая, дом 28 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства (б/у), расположенные по адресу: Гродненская область, Волковысский район, г. п. Красносельский, ул. Короткая, дом 28**

| № п/п | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 696 | Грузовой специальный самосвал GAZ-SAZ-3507, рег. знак АЕ 5022-4, 1988 г. в. | 4 680,00 |
| 2 | 1639 | Грузовой фургон изотермический MAZ 437043-341, рег. знак АЕ 0919-4, 2011 г. в. | 34 440,00 |
| 3 | 1315 | Легковой седан «Ауди А4», рег. знак 0510 АС-4, 1996 г. в. | 9 480,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYBY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
**Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на его проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 6–10 % от цены продажи предмета электронных торгов (подробнее на ЭТП «ИПМ-Торги» в карточке лота) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона. Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты Продавца по оказанию услуг по независимой оценке предмета электронных торгов (суммы указаны на ЭТП «ИПМ-Торги» в карточке лота)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.06.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**в г. п. Плещеницы, ул. Воровского, д. 122**

Логойского района Минской области

Плещеницкий сельский исполнительный комитет в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **г. п. Плещеницы, ул. Воровского, д. 122** Логойского района Минской области (правообладатель – Каролик Александра Ефимовна).

Сельсполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: **223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В.И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-6-35.**

УНП 600181684



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**в г. п. Плещеницы, пер. Дзержинского, д. 30**

Логойского района Минской области

Плещеницкий сельский исполнительный комитет в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **г. п. Плещеницы, пер. Дзержинского, д. 30** Логойского района Минской области (правообладатель – Возный Валерий Владимирович).

Сельсполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: **223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В.И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-6-35.**

УНП 600181684






УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — 2025

# ЧАС ПРАВЕРЫЦЬ ВЕДЫ

## 26 мая пачнуцца выніковыя іспыты для больш як 56 тысяч выпускнікоў

У гэты дзень яны будуць здаваць ЦЭ ў пісьмовай форме па фізіцы, матэматыцы, хіміі, біялогіі, замежнай мове (англійскай, нямецкай, іспанскай, французскай, кітайскай), гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі (найноўшы час), геаграфіі, грамадазнаўстве (па выбары навучэнца). 29 мая выпускнікі будуць здаваць ЦЭ па беларускай або рускай (на выбар) мовах. У гэтыя ж тэрміны пройдзе і цэнтралізаванае тэсціраванне.

Сёння мы нагадваем старшакласнікам правілы правядзення цэнтралізаванага экзамена, агучваем новаўвядзенні, а дапамагае ў гэтым **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Ірына КАРЖОВА.**

### ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ЦЭ І ЦТ

26 мая — **ЦЭ** па прадмеце на выбар *(для 11-класнікаў)*; **ЦТ** па прадмеце на выбар *(для выпускнікоў мінулых гадоў і выпускнікоў каледжаў)*.

29 мая — **ЦЭ** па беларускай або рускай мове *(для 11-класнікаў)*; **ЦТ** па беларускай або рускай мове *(для выпускнікоў мінулых гадоў і выпускнікоў каледжаў)*.



Фота БелТА.

2 і 5 чэрвеня — **ЦТ** па прадмеце на выбар *(для ўсіх абітурыентаў)*.

Рэзервовыя дні для **ЦТ**: 19, 21, 23 чэрвеня.
Рэзервовыя дні для **ЦЭ**: 21, 23 чэрвеня, іншыя тэрміны – 18, 20 жніўня.

### ПЛЮС АДЗІН

— Акрамя традыцыйных спецыфікацый па 15 вучэбных прадметах, дададзеная новая — па гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, — расказвае яна. — Змест экзаменацыйнай (тэставай) работы па гэтым прадмеце арыентаваны на адзінаццацікласнікаў, якія асвойваюць эксперыментальную вучэбную праграму.

### ТЭРМІНЫ

— Сёлета, як і летась, цэнтралізаваныя экзамены і тэсціраванне будуць праходзіць у адзіныя тэрміны, — паведаміла Ірына Каржова. — Цэнтралізаваны экзамен выпускнікі нашых школ здаюць 26 і 29 мая, сертыфікаты па выніках здачы ЦЭ абітурыенты выкарыстоўваюць для паступлення ва ўстанову вышэйшай адукацыі. 2 і 5 чэрвеня можна прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне па профільным прадмеце. Далейшы шлях — у прыёмную камісію.

### НЕ ЗДАЎ, АЛЕ НЕ ЗДАЎСЯ

— Навучэнцы, якія на ЦЭ атрымалі «0» балаў, у гэтым годзе атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі атрымаць не змогуць, — кажа начальнік упраўлення. — Яны атрымаюць даведку аб навучанні. Ім неабходна будзе зарэгістравацца на ЦЭ ў наступным годзе. Аднак унесены змены ў нарматыўныя дакументы, якія дазволяць такім дзецям прайсці ЦЭ ў іншыя тэрміны — у жніўні. Асабліва падкрэслю, што гэта новаўвядзенне будзе дзейнічаць толькі з 2026 года.

### БЕЗ ГАДЖЭТАЎ І НАСТАЎНІКАЎ-ПРАДМЕТНІКАЎ

— Сёлета забарона на выкарыстанне смартфонаў і сродкаў аўдыя-, відэа-, фотафіксацыі распаўсюджваецца на ўсёй тэрыторыі пункта правядзення ЦЭ, — папярэджвае прадстаўнік Мінадукацыі.

Паводле яе слоў, на такую меру прымусіў пайсці вопыт мінулых гадоў, калі некаторыя ўдзельнікі ЦЭ спрабавалі скарыстацца гаджэтамі, выходзячы з аўдыторыі, — у калідоры, прыбіральні... Таму мабільныя тэлефоны ці іншыя сродкі сувязі будуць здавацца тымі, хто экзаменуецца, яшчэ на этапе прапускнога кантролю. Пры гэтым выкарыстанне тэлефонаў у дварах пунктаў тэсціравання дазволена. Калі экзамен скончыўся, вы выйшлі з аўдыторыі ў двор пункта — калі ласка, карыстайцеся!



Фота Лізаветы ГОЛАД.

— Што датычыцца педагогаў-прадметнікаў, то гэта другое новаўвядзенне ў ЦЭ: на цэнтралізаваным экзамене яны больш прысутнічаць не будуць, — дзеліцца навіной Ірына Каржова. — У мінулыя гады прадметнікі разам з іншымі настаўнікамі ў аўдыторыі дапамагалі запаўняць бланкі, адказвалі на агульныя пытанні. Аднак пачалі з'яўляцца здагадкі, што яны падказваюць «сваім». Каб падобныя чуткі больш не ўзнікалі, было прынята рашэнне аб выключэнні прадметнікаў з ліку прысутных у аўдыторыі.

### У ШКОЛЕ, АЛЕ НЕ Ў СВАЁЙ

— Для правядзення ЦЭ падрыхтавана 144 пункты, у ліку якіх 57 школ і гімназій, — расказвае далей намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення. — Калі цэнтралізаваны экзамен праходзіць на базе школы, то педагогі, якія на ім прысутнічаюць, не павінны быць яе супрацоўнікамі.

Закранула яна і пытанне дастаўкі дзяцей да месца правядзення ЦЭ — яны, як і ў ранейшыя гады, будуць прыбываць да пункта здачы цэнтралізавана, у суправаджэнні педагогаў.

— Месца збору — установа адукацыі, — дадала Ірына Каржова. — Выпускнікоў сельскіх школ будуць дастаўляць на ЦЭ на школьным аўтобусе. Час пачатку іспытаў — 11.00. Прыбыццё ў пункт ЦЭ не пазней, чым за 30 хвілін да пачатку экзамену.

### КАЛІ ЎМЯШАЛАСЯ ХВАРОБА

— Здараецца, што ў працэс здачы ЦЭ нечакана ўмешваюцца такія непрыемныя фактары, як, напрыклад, хвароба, — знаёміць з магчымай сітуацыяй прадстаўнік Мінадукацыі. — Што перш за ўсё трэба зрабіць выпускніку? Атрымаць адпаведны медыцынскі дакумент, каб можна было здаць экзамен у рэзервовы дзень. Рашэнне аб допуску на ЦЭ ў такіх выпадках прымаюць камісіі, створаныя галоўнымі ўпраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў, камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама, на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць значнасць прычыны адсутнасці на ЦЭ ў асноўны дзень. У выпадку хваробы — гэта даведка ад урача.

Яна расказала, што летась 9 хлопчыкаў і дзяўчынак не змаглі завяршыць экзаменацыйную работу па прычыне дрэннага самаадчування, і падкрэсліла:

— Калі такое здараецца, аб гэтым трэба паведаміць педагагічнаму работніку, які знаходзіцца ў аўдыторыі. У кожным пункце ЦЭ прадугледжана работа медыка, які акажа дапамогу. У журнале, які знаходзіцца ў медыцынскім пункце, і ў пратаколе правядзення ЦЭ ў аўдыторыі будзе зроблены адпаведны запіс, які стане пацвярджальным дакументам дрэннага самаадчування і падставай для допуску на экзамен у рэзервовы дзень.

### ПЕРАВОДЗІМ БАЛЫ Ў АДЗНАКУ

— Тэставы матэрыял па ўзроўні складанасці не змяніўся і па-ранейшаму змяшчае заданні пятага ўзроўню складанасці, — працягвае знаёміць з нюансамі начальнік упраўлення. — На сайтах РІКВ і Міністэрства адукацыі апублікаваны табліцы адпаведнасці першасных і тэставых балаў па ўсіх прадметах. Тут жа прадстаўлены шкалы пераводу балаў, атрыманых удзельнікамі ЦЭ па стабальнай шкале, у адзнаку па дзесяцібальнай. Напрыклад, каб атрымаць «дзявятку» па рускай або беларускай мове, трэба набраць ад 68 да 81 тэставага бала. Кожны абітурыент, які будзе здаваць ЦЭ або ЦТ, убачыць у асабістым кабінеце копію сваёй работы.

### КАТЭГАРЫЧНАЕ «НЕ»!

— Нагадаю, што забаронена ўдзельнікам ЦЭ і ЦТ: фальсіфікаваць даныя ў бланку рэгістрацыі і адказаў, мяняцца месцамі і экзаменацыйнымі матэрыяламі, прасіць падказку ў каго-небудзь, уносіць інфармацыю ў бланк адказаў пасля заканчэння часу тэсціравання, мець пры сабе сродкі сувязі і электронную тэхніку, выносіць з аўдыторыі экзаменацыйныя матэрыялы, лісты для рабочых запісаў, пісьмовыя нататкі, фатаграфаваць экзаменацыйны матэрыял, размаўляць паміж сабой, — пералічвае прадстаўнік Мінадукацыі. — Удзельнік, які парушыў патрабаванні праходжання ЦЭ, пакідае аўдыторыю. Яго бланк адказаў не правяраецца.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# ПАЧАТАК НОВАГА ЖЫЦЦЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пралог «Вучаць у школе» адкрыў святочную праграму вечара. Пад вядомую кампазіцыю ў сучаснай апрацоўцы панастальгіравалі школьнікі розных пакаленняў.





Фота БелТА.

Выпускнікоў вітаў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** «Гэта найлепшыя з лепшых. Выпускнікі, якія праявілі сябе ў вучобе, у спорце, у творчасці, былі актывістамі грамадскіх маладзёжных арганізацый. Вядома, гэта свята і для ўсіх 56 тысяч дзяцей, якія выпускаюцца з нашых школ. Для іх гэта першы крок у дарослае жыццё, час вельмі хвалюючы і адказны. І мы верым, што яны паспяхова здадуць экзамены, пройдуць тэставанне і паступяць ва ўніверсітэты», — падкрэсліў ён.

Прагучаў апошні званок, аддаючы даніну традыцыі. Адзінаццацікласнікі пранеслі першаклашак са званкамі.

Дзясяткі пар закружылі ў пяшчотным і кранальным выпускным вальсе. Пад фінальную песню «Твой час прыйшоў» сотні маладых людзей далучыліся да маштабнага танцавальнага флэшмобу.

Для выпускнікоў арганізавалі маштабнае свята на пляцоўцы і ўнутры лядовага палаца. Сэлфі з крэатыўных фотазон разлятаюцца па ўсёй краіне. Для дзяцей, якія развітваюцца са школай, арганізаваны гульнявыя пляцоўкі, тэлестудыі, шмат сюрпрызаў і інтэрактыву.



Фота gp.by.

Завяршыла гэты вечар дыскатэка і святочны феерверк. А раніцай для выпускнікоў падрыхтавана асаблівае падарожжа ў мінулае дзеля сучаснасці і будучыні. Экскурсійная праграма для дэлегацый абласцей і Мінска прадугледжвае патрыятычны маршрут у ваенна-гістарычны комплекс «Партызанская крынічка» і мемарыял «Дзецям — ахвярам вайны» ў аграгарадку Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна.

**Па матэрыялах БелТА.**

# КАПІТАЛЬНЫЯ РАМОНТЫ І 10 000 ПЕРШАКЛАСНІКАЎ

## На падрыхтоўку школ Гродзеншчыны да новага навучальнага года запланавана каля 8,6 мільёна рублёў

Пра гэта журналістам паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Руслан АБРАМЧЫК. Падрыхтоўка ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі да новага 2025/2026 навучальнага года абмяркоўвалася на пасяджэнні аблвыканкама ў чацвер 22 мая.



Фота БелТА.

Клопат дзяржавы — стварыць для навучання дзяцей спрыяльныя ўмовы, таму стану школ удзяляецца вялікая ўвага. На Гродзеншчыне з гэтай нагоды абследаваны ўсе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, складзены адпаведныя акты. Маніторынг праводзілі міжведамасныя раённыя камісіі пад кіраўніцтвам старшыняў раённых выканаўчых камітэтаў.

— Далей будуць прыняты меры па ліквідацыі асобных недахопаў, якія абазначаць цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, органы пажарнага і аналітычнага нагляду, органы ўнутраных спраў. Усе работы да 20 жніўня ва ўстановах агульнай адукацыі будуць завершаны. На гэтыя мэты запланавана выдаткаваць больш за 8 мільёнаў рублёў бюджэтных сродкаў і каля 600 000 рублёў пазабюджэтных і спонсарскіх сродкаў. Школы гатовы да пачатку рамонтных работ, вызначаны крыніцы фінансавання, падрадчыкі, ёсць праектна-каштарысная дакументацыя. Будзе праведзена 20 капітальных рамонтаў, а таксама 5 харчаблокаў капітальна адрамантуюць. Рыхтуецца да адкрыцця новая школа ў горадзе Астраўцы на 500 месцаў. Вядуцца работы па падборы педагагічных кадраў і па камплектаванні навучэнцамі, вызначана кандыдатура дырэктара школы, — расказаў Руслан Абрамчык.

Удасканальваецца і матэрыяльна-тэхнічная база. Вядуцца работы па закупцы тэхналагічнага і навучальнага абсталявання. Плануюцца пастаўкі камп'ютарнай тэхнікі — як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і за кошт сродкаў раённых выканаўчых камітэтаў. Вызначаны планы па дадатковым набыцці спартыўнага інвентару для таго, каб забяспечыць стапрацэнтную ўкамплектаванасць кожнай установы адукацыі. На дадзены момант укамплектаванасць складае 99,8 %. Акрамя таго, на працягу 2025 года будуць закуплены 56 аўтобусаў для падвозу школьнікаў да месца навучання. Па выніках работы ў 2025-м ні ў адным раёне Гродзенскай вобласці больш не застанецца аўтобусаў з тэрмінам службы больш за 10 гадоў.

Усяго ў новым навучальным годзе ў 297 установах агульнай сярэдняй адукацыі рэгіёна будуць вучыцца каля 118 000 дзяцей, чакаецца папаўненне школьнай сям'і 10 тысячамі першакласнікаў. Безумоўна, гэта важны этап у жыцці і дзіцяці, і бацькоў, таму ўвесь май праходзяць сустрэчы з мамамі і татамі будучых першакласнікаў.

— Вырашаюцца пытанні залічэння, каб забяспечыць поўную празрыстасць працэсу ва ўстановах адукацыі. Уся неабходная інфармацыя ёсць на сайце кожнай школы. Даныя аб колькасці свабодных месцаў будуць увесь час абнаўляцца,— дадаў Руслан Абрамчык. — Шэрагі педагогаў сёлета папоўняць 400 маладых спецыялістаў. Для іх будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы.

У пасяджэнні Гродзенскага аблвыканкама, прысвечаным гатоўнасці школ да новага навучальнага года, узяў удзел Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч.

**Веранікa КАЗЛОЎСКАЯ.**


Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1**

**Право заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на 3 года на административное помещение на 1-м этаже здания общежития (132,10 кв. м,** инвент. № 700/D-53275), по адресу: **г. Могилев, ул. 30 лет Победы, 26. Размер арендной платы за месяц – 669,47 бел. руб.**

**Начальная цена – 619,88 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены лота

**Задаток 619,88 бел. руб.** перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок оплаты предмета аукциона: 3 (три) рабочих** дня после проведения аукциона

**Срок подписания договора аренды: 10 (десять) рабочих** дней после проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 24.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Лот № 2**

**Магазин (911.4 кв. м,** инвент. № 700/С-62152), по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. 30 лет Победы, 28А.**
***Сведения о земельном участке*: пл. 0,0934 га,** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 464 832,00 бел. руб.** (снижена на 52 %)
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 05.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение по лоту № 1 – 10 %, по лоту № 2 – 2 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 24.06.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 220882015601000142 площадью 0,1700 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Далековский с/с, д. Хвосты, 28Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Ограничения (обременения) прав: на природных территориях, подлежащих специальной охране ((в водоохраной зоне) оз. Высокое), площадь 0,1700 га, на природных территориях, подлежащих специальной охране (в охранных зонах особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»)), площадь 0,1700 га.

**Нач. цена: 10 000,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608. Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 23.06.2025.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№ 30856), на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru.

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ

# СЯМ'Я ПЕРШ ЗА ЎСЁ

## Заснавальніца Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў пра шлях у тры дзесяцігоддзі, падтрымку дзяржавы і тое, як сумяшчаць дзяцей і кар'еру

Днямі грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» адзначыла сваё 30-годдзе. Сёння яно аб'ядноўвае чатыры тысячы сем'яў, а дапамагло за гэты час — дзясяткам тысяч, бо рашэнні, прынятыя ў нашай краіне на заканадаўчым узроўні, насамрэч падтрымалі многіх, а для некаторых сталі і першым крокам у стварэнні вялікай сям'і. Усе гэтыя гады арганізацыю ўзначальвае Тацццяна КРАЎЧАНКА — шматдзетная маці (і ўжо бабуля і прабабуля), актыўная і нераўнадушная жанчына.



Тацццяна КРАЎЧАНКА (*справа*) з актывам грамадскай арганізацыі.

## ВАЖКІЯ СТЫМУЛЫ

Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў пачыналася з невялікай сталічнай арганізацыі. Каля яе вытокаў і стаяла Тацццяна Аляксандраўна са сваімі паплечніцамі. У хуткім часе ідэю аб'яднання падхапілі шматдзетныя жанчыны з Гомеля, Наваполацка, Гродна і іншых гарадоў.

— Калі вярнуцца ў тыя няпростыя часы пачатку 1990-х, сітуацыя ў краіне была катастрафічная: пасля развалу Саюза ўсе шматдзетныя аказаліся без падтрымкі. Спынілася льготнае прадастаўленне жылля, іншая дапамога. Сем'і засталіся сам-насам з праблемамі. Для таго каб дапамагчы ім, мы стварылі гэту арганізацыю і дзейнічалі ад яе імя, — згадвае Тацццяна Краўчанка.

У тым ліку і з падачы Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў у 2000-м быў падрыхтаваны і выйшаў першы ўказ кіраўніка дзяржавы, які прадугледжваў пазачарговае будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў.

**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 21.00** Беларусь. Навіны.
**11.40** «Нашы. Ваенкары» (12+).
**12.10** «Доктар Мяснікоў» (12+).
**13.05** «Вялікія перамены».
**14.50** «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+)
**17.50** «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**19.45** «Плюс-мінус».
**21.30 Фільм «Аддам маці замуж» (16+).**
**0.55 Фільм «Водпуск летам» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10** Сёння. Галоўнае.
**6.20** Смачна есці (12+).
**7.25** Беларусы (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**8.50** Адзін дзень (12+).
**9.25** «Проста і смачна» (6+).
**10.20** Знак якасці (6+).
**10.45** «Галоўная дарога» (16+).
**11.20** «Жывая ежа з Сяргеем Малазёмавым» (12+).
**12.15** Кватэрнае пытанне (0+).
**13.15** «Паедзем, паядзім!» (12+)
**14.15 Фільм «Культпаход у тэатр» (12+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**17.10** «Сакрэт на мільён» (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.20 Серыял «Кантужаны-2» (16+).**
**23.50** «Ты не паверыш!» (16+)

### Беларусь 3

**7.30** «Брыдкае качаня». Мультфільм (0+).
**7.50** «Сіла веры».
**8.15, 15.25** «Навіны культуры».
**8.30 «Вам і не снілася...» Мастацкі фільм (12+).**
**10.05** «Беларуская кухня».
**10.35** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.00** «То! Лато».
**11.25 «Востраў скарбаў». Мастацкі фільм (6+).**
**15.00** «Навука побач» (6+).
**15.40** «Веды ў кубе».
**16.15** «Мелодыі сэрца».
**17.55 «Па сямейных абставінах». Мастацкі фільм (12+).**
**20.25** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Вызваленне». Кінаэпапея (12+).**
**22.20** «Вяртанне».
**22.45** «Без тэрміну даўнасці». Спектакль.

### Беларусь 5

**7.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «МФК Мінск» — «Вітэн» (Орша).
**8.55** На спорце.
**9.15** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Жанчыны. Беларусь — Фінляндыя.
**11.10** Спартыўная цікавасць.
**11.55** Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. БК «Гродна-93» — БК «Мінск». У перапынку — «Дай пяць!»
**13.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «ВРЗ» (Гомель) — «Сталіца» (Мінск).
**15.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Мяшкоў» (Брэст) — «СКА-Мінск» / Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Славія» (Мазыр).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «МЛ» (Віцебск) — ФК «Віцебск». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**19.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Нафтан» (Наваполацк). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**21.55, 1.10** Змешаныя адзінаборствы.
**23.30** Баскетбол. Адзіная ліга.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 16.05** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**11.05** «Прынцэса і цмок» (6+).
**12.10 Фільм-фэнтэзі «Таямніца амулета» (12+).**
**13.50** Як дома (16+).
**14.20, 23.55 Серыял «Сторыз» (16+).**
**14.50** «Майстар кандытар» (16+).
**16.10 Дэтэктыў «Арлінская». Фільм «Стрэлы Нептуна» (12+).**
**17.55 Дэтэктыў «Арлінская». Фільм «Таямніца Венеры» (12+).**
**19.45** «Чатыры дачы» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Дах свету» (16+).**

## Нядзеля, 1 чэрвеня

### Беларусь 1

**5.55 Меладрама «Гэтым летам і назаўжды» (16+).**
**7.35** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Арсенал» (12+).
**9.50 Драма «Край надламанага месяца» (16+).**
**11.45 «Генацыд. Апошнія сведкі». Мастацка-публіцыстычны фільм (16+).**
**12.20** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45 Меладрама «Васнявова» (12+).**
**15.25** Вакол планеты.



**16.05** Маршрут пабудаваны (12+).
**16.40, 19.10 Меладрама «Свая чужая дачка». (16+).**
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.35 Меладрама «Адваротны бок душы» (16+).**



### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**7.10** «Наша смешнае жыццё» (16+).
**7.40** «Жыццё іншых» (12+).
**8.30** «Народны ДАСТ» (16+).
**09.10** «Метэагід».
**09.35** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Народны кухар» (12+).
**12.15 Фільм «Не ў хлопцах шчасце» (16+).**
**14.10, 16.20 Фільм «Лінія жыцця» (12+).**
**18.05** «Пераспявай зорку» (12+).
**20.00** Контуры.
**21.15 Фільм «Ідэальны пацыент» (12+).**



**0.50** «Што? Дзе? Калі?» (16+)

### СТБ

**6.50 «Чалавек з дому насупраць». Серыял (12+).**
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.45** Дак. праект «Следства вядзе КДБ» (16+).
**12.35, 13.45 «Хуткая дапамога-4». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**17.00, 21.15 «Хуткая дапамога-5». Серыял (16+).**
**19.30** «Тыдзень».
**20.50** «Слова і справа».
**21.00** «Спорт-таймер».
**0.10** Дак. праект «Дзевяностыя» (16+).

### МІР

**5.00** Мультфільмы (6+).
**6.45 Маст. фільм «Вылет затрымліваецца» (16+).**
**8.20** «Дыктар робіць» (16+).
**9.30** «ФазендаЛайф» (6+).
**10.00, 13.00** Навіны.
**10.10 Маст. фільм «Там, на невядомых дарожках» (12+).**



**11.40, 13.10 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (16+).**
**13.25 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (16+).**
**15.15 Маст. фільм «Карона расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (16+).**
**18.00, 0.00** «Разам» (16+).
**19.00 Маст. фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч ізноў ідуць дажджы» (16+).**
**20.55 Мастацкі фільм «Цацка» (16+).**
**22.55 Маст. фільм «Сто грамаў для адвагі» (16+).**



**1.00 Маст. фільм «Элефант» (16+).**
**2.25 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (16+).**
**3.55 Маст. фільм «Дзяўчына са спяшаецца на спатканне» (16+).**



### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 9.35, 10.30, 11.30, 12.30, 13.25, 14.30, 15.35, 16.30, 17.30, 18.30, 19.45, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 1.00, 3.00** Навіны. Дайджэст.
**5.05, 9.30, 12.50, 18.50, 22.50, 0.25** Баявое дзяжурства (12+).
**5.15, 6.40, 9.40, 10.15, 12.35, 14.15, 14.40, 15.40, 16.40, 17.35, 18.35, 20.40, 21.30** Спецыяльны рэпартаж (12+)
**5.40, 7.45, 11.35, 13.40, 15.20, 18.15, 20.05, 21.15, 22.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** Вынікі тыдня.
**6.20, 7.20, 9.20, 13.35, 16.20** Сусветная навука (12+).
**7.15, 11.25, 17.50, 19.50, 2.25** Аўтарскі пагляд (12+).
**8.15** Вакол планеты (12+).
**9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**10.35, 19.15, 22.25, 23.15, 3.10, 4.25** Тэлефільм (12+).
**11.00, 16.00, 0.30** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**11.50** Вам тэлеграм (12+).
**13.20, 17.20, 19.10, 00.50, 03.50** Громаў LIVE (12+).
**14.00, 18.00, 01.10** Твой горад (12+).
**14.35, 16.35, 01.05, 03.05** Дзень спорту.
**0.05, 2.00, 4.00** Галоўны эфір (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.55 Фільм «Аддам маму замуж» (16+).**



**10.15** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.35** «Свае».
**11.50** «Нашы. Ваенкары».
**12.30** «У пошуках ісціны».
**13.15, 15.00** Фестываль дзіцячай мастацкай гімнастыкі «Аліна».
**15.30** Вялікі канцэрт да Дня абароны дзяцей.
**17.50** «Песні ад усёй душы» (12+).
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Акцэнты».
**22.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**22.55** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.30** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Сэнс жыцця (12+).
**6.50** Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
**7.25** «Дача» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Навука побач» (6+).
**8.55** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**9.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.25** «Кватэрнае пытанне. by» (12+).
**11.00** «Першая перадача» (16+).
**11.35** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.25** «Дачны адказ» (0+).
**13.30** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.25 Меладрама «Бальная сукенка» (6+).**



**16.20 Фільм «Можна, я буду клікаць цябе мамай?» (16+)**



**18.05** «Следства вялі...» (16+)
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20 Серыял «Кантужаны-2» (16+).**



**23.40** «Зоркі сышліся» (16+).

### Беларусь 3

**7.30** «Чуня». Мультфільм (0+).
**7.40** «Веды ў кубе».
**8.20 «Казка пра цара Салтана». Мастацкі фільм (6+).**



**9.50** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50** «Культурны тыдзень».
**12.30 «Па сямейных абставінах». Мастацкі фільм (12+).**



**14.50** Сумесны канцэрт Беларускай дзяржаўнай філармоніі і расійскага праекта «Руская фартэпіянная школа. Майстры і наша будучыня».
**17.00** «Суперлато».
**17.35** Вечары з Сімфанічным аркестрам.
**18.40** «Вызваленне». Кінаэпапея (12+).



**20.00** «Культурны тыдзень».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Востраў скарбаў». Мастацкі фільм (6+).**

### Беларусь 5

**7.55** Фактар сілы.
**7.30** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «ВРЗ» (Гомель) — «Сталіца» (Мінск).
**09.25, 23.55** Змешаныя адзінаборствы.
**12.00** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «БНТУ-БелАЗ» (Мінск) — ГК «Гомель».
**13.40** Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**15.35** На спорце.
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. ФК «Слуцк — ФК «Гомель». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**17.55** Футбол. Кубак Расіі — 2024 г. / 2025 г. ФК «Растоў» — «ЦСКА» (Масква). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Арсенал» (Дзяржынск) — ФК «Маладзечна».
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**23.10** Вынікі тыдня.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 11.30, 15.55** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**11.00** Я з вёскі (12+).
**12.00** Смачна есці (12+).
**12.40** «Чатыры дачы» (16+).
**14.05** «Сакрэты на кухні» (16+).
**15.00** Карысная праграма (16+).
**15.10** «Чорны спіс» (16+).
**16.00 Фільм-фэнтэзі «Таямніца амулета» (12+).**
**17.35, 23.45 Серыял «Сторыз» (16+).**
**18.05** «Геаграфія Уральскіх пельменяў. Аўстралія» (16+).
**19.25 Камедыя «Украдзі маю жонку» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Серыял «Кафэ «Куба» (16+).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор электронных торгов:** Руденский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Пуховичский р-н, г. п. Руденск, ул. Ленинская, 17, тел. (801713) 90080.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **24 июня 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № п/п | Наименование | Адрес | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) | Расходы по подготовке документации (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (наименование – здание одноквартирного жилого дома) с инвентарным номером 602/С-4382, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624475706601000035 (присвоен предварительно) | 222850, Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, д. Цитва, ул. Солнечная, д. 42 | 10 378,83 белорусского рубля (десять тысяч триста семьдесят восемь белорусских рублей 83 копейки) | 1 037,88 | 314,72 |
| 2 | Объект недвижимости: капитальное строение (наименование – жилой дом) с инвентарным номером 602/С-7566, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624475702601000095 (присвоен предварительно) | 222850, Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, д. Вороничи, ул. Центральная, д. 87 | 10 378,83 белорусского рубля (десять тысяч триста семьдесят восемь белорусских рублей 83 копейки) | 1 037,88 | 314,72 |

Характеристика объекта, расположенного по адресу: д. Цитва, ул. Солнечная, д. 42: жилой дом (деревянный) с сенями 1950 года постройки. Общая площадь жилого помещения – 23,5 кв. м, жилая – 16,1 кв. м, кровля шиферная, полы дощатые, окна и двери деревянные. На территории земельного участка имеется колодец.

Характеристика объекта, расположенного по адресу: д. Вороничи, ул. Центральная, д. 87: жилой дом (деревянный) с сенями и верандой, 1918 года постройки. Общая площадь жилого помещения – 34,7 кв. м, жилая – 24,4 кв. м, кровля шиферная, полы отсутствуют, окна и двери деревянные. На территории земельного участка имеются хозяйственные постройки (сарай, уборная) и колодец.

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах.

Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – **19 июня 2025 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр пустующих жилых домов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

Победитель электронных торгов (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола обязан: внести плату за предмет торгов; возместить затраты за организацию и проведению электронных торгов, в том числе расходы, связанные с проведением оценки рыночной стоимости пустующего жилого дома; подать в Руденский сельисполком заявление о предоставлении земельного участка.

В течение 10 рабочих дней после совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) вышеуказанных действий Руденский сельисполком заключает с ним договор купли-продажи и передает ему копию решения суда о признании пустующего жилого дома выморочным и один экземпляр протокола.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу **info@gki.gov.by,** Минского городского исполнительного комитета **mgik@minsk.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **info@minsk-region.gov.by,** БУТБ **et.butb.by,** объявление в газете «Звязда» и в государственном информационном ресурсе «Единый реестр пустующих домов».

# ПАД СЦЯГАМ І З ГІМНАМ

## Як складваецца сітуацыя з допускам нашых спартсменаў да міжнародных спаборніцтваў

Сітуацыя з паўнавартасным вяртаннем беларускіх спартсменаў на міжнародную арэну нагадвае арэлі. Спачатку ўверх — ад радасці, што з аднаго віду спорту санкцыі знялі поўнасцю, затым уніз — ад крыўды, што ў іншых гэта пытанне нават не абмяркоўваецца. Недзе пасярэдзіне — допуск трэціх, што ўжо добрая навіна, але з такой колькасцю абмежаванняў і нюансаў, што нават не зразумела, радавацца ці не. Зусім не такія эмоцыі павінны бударажыць спартыўных аматараў, але як ёсць.

Днямі парадавалі дзюдаісты. Па рашэнні выканаўчага камітэта Міжнароднай федэрацыі дзюдо беларускія атлеты дапушчаны да міжнародных турніраў пад Дзяржаўным сцягам з гербам і гімнам нашай краіны з 1 чэрвеня 2025 года. Як адзначыў прэзідэнт арганізацыі Марыус Візер, міжнародная федэрацыя з нецярпеннем чакае магчымасці зноў вітаць беларускіх спартсменаў на татамі пад Дзяржаўным сцягам Беларусі, падтрымліваючы шматгадовыя каштоўнасці і традыцыі дзюдо. Дарэчы, Міжнародная федэрацыя дзюдо стала адной з першых міжнародных структур, якая ў 2023 годзе допусціла беларусаў. Няхай спачатку ў нейтральным статусе, але без іншых бяздумных абмежаванняў. Поўнае вяртанне стала пытаннем часу. Вернуцца на міжнароднае татамі беларусы ўжо зусім хутка і, спадзяёмся, эфектна — з 13 да 19 чэрвеня ў Будапешце будзе праходзіць чэмпіянат свету. Нашу краіну на ім прадставяць Ягор Варапаеў і Аляксандр Сідорык.

Можна парадавацца і за фехтаванне. Міжнародная федэрацыя фехтавання (FIE) абвясціла аб допуску беларускіх і расійскіх спартсменаў да ўдзелу ў камандных міжнародных спаборніцтвах. Праўда, у нейтральным статусе і пад сцягам FIE замест нацыянальнага. Да гэтага нашы спартсмены выступалі на міжнародных турнірах толькі ў індывідуальным разрадзе. Яшчэ адзін вельмі правільны і важны крок зроблены. І вельмі своечасовы — з 14 да 19 чэрвеня ў Італіі пройдзе чэмпіянат Еўропы.

Камандай беларускага алімпійскага камітэта нашы спартсмены выступяць на Еўрапейскім летнім юнацкім алімпійскім фестывалі Скоп'е-2025. Турнір у Паўночнай Македоніі пройдзе з 20 да 26 ліпеня. Чаму нашы атлеты могуць выступаць у форме НАК, камандай беларускага алімпійскага камітэта, але не выступаць камандай Беларусі, не зусім зразумела? Аднак тое, што рашэнне выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў прынята на карысць нашых спартсменаў, ужо радуе. У Нацыянальным алімпійскім камітэце паведамілі, што на фестывалі выступіць 48 беларусаў, якія будуць спаборнічаць у 7 відах спорту: плаванні, дзюдо, таэквандо, веласпорце, бадмінтоне, настольным тэнісе і стральбе (кулявой).



Пакуль летнія віды спорту паціху разварушваюцца, у зімовых відаў на гэта часу няма: не так і далёка да зімовых Алімпійскіх гульняў 2026 года. А гэтыя федэрацыі якраз такі і не надта спяшаюцца. Толькі Міжнародны саюз канькабежцаў апублікаваў спіс атлетаў, дапушчаных да кваліфікацыйных стартаў на зімовыя Алімпійскія гульні — 2026 у Мілане і Карціна-д'Ампеца. У гэтым спісе — 13 беларусаў, прадстаўнікі трох відаў спорту. У шорт-трэку за права выступіць на Алімпіядзе будуць змагацца Мікіта Мігдалёў і Яна Дамброўская. У фігурным катанні — Вікторыя Пласконная і Уладзіслаў Сыцік (танцы на лёдзе), Вікторыя Сафонава, Анастасія Сідарэнка, Васіль Бараховскі і Яўген Пузанаў (адзіночнае катанне). За алімпійскія ліцэнзіі таксама могуць спаборнічаць канькабежцы Ягор Дамарацкі, Яўген Болгаў, Віктар Рудэнка, Марына Зуева і Кацярына Гагіева. Такое рашэнне днямі прыняў Міжнародны саюз канькабежцаў. У шорт-трэкістаў шлях на Алімпіяду будзе складацца з чатырох этапаў сусветнага тура ў кастрычніку—лістападзе. Кваліфікацыя ў канькабежцаў — гэта чатыры этапы Кубка свету ў лістападзе—снежні. У фігурыстаў кваліфікацыйны турнір адзін — ён пройдзе ў верасні ў Пекіне.

Ад Міжнароднага саюза біятланістаў і Міжнароднай федэрацыі лыжных гонак пакуль цішыня. Але спартсмены, загартаваныя крызісам апошніх трох гадоў, не апускаюць рукі і вераць у лепшае. На шчасце, добрыя прыклады ёсць.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота judo.by**.


**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом** (фундамент – столбы бетонные, площадь застройки – 51 кв. м, процент готовности – 6 %) по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Столбница, ул. Приозёрная, 8А и земельный участок с кадастровым № 221282912101000021 площадью 0,1500 га для строительства и обслуживания жилого дома в частную собственность по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Столбница. Ограничения: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов (оз. Зароновское), площадь 0,1500 га.

**Начальная цена предмета аукциона**
(в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок):
**3043,06** (1319,49/1723,57) бел. руб.
**Задаток:** 304,30 бел. руб.
Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 43,36 %.
**Реквизиты для внесения задатка:**
BY14AKBB36043140627462000000
в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минска,
БИК банка: AKBBBY2X, УНП 300965239,
код операции 40901.
Получатель платежа: Зароновский сельисполком.

**Дата, время и место проведения аукциона: 25.06.2025 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 26.05.2025 до 17.30 24.06.2025.**

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия аукциона**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

**Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ)**, которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**
**по принудительной продаже жилого помещения в г. Гродно 24 июня 2025 г.**

| № лота | Адрес жилого помещения | Сведения о жилом помещении | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **г. Гродно, ул. Поповича, д. 9, кв. 114** | Изолированное помещение с инв. № 400/D-15984 (квартира 114) общей площадью 43,3 кв. м, жилая площадь 19,1 кв. м. Однокомнатная, расположена на втором этаже девятиэтажного жилого дома. Обременение: арест. Ориентировочные расходы, связанные с изготовлением документации: 596,32 руб. | 76 600,00 | 15 300,00 |

В жилом помещении зарегистрирован и проживает должник. При отказе бывшего собственника освободить проданное с публичных торгов жилое помещение, он подлежит выселению в судебном порядке. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) самостоятельно осуществляет действия, связанные с оформлением перехода права собственности на недвижимое имущество в соответствии с законодательством.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: 8 (0152) 62-60-55, 62-60-56.

**Аукцион состоится 24 июня 2025 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал.**

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства (далее, если не предусмотрено иное, – граждане), юридические лица, в том числе иностранные и международные, если иное не установлено законодательными актами или международными договорами РБ.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, лично либо через своего представителя в установленный в извещении срок подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе по утвержденной форме, заверенную банком копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона, а также заключает с организатором аукциона соглашение. Задаток вносится в белорусских рублях до 18 июня 2025 г. в сумме согласно настоящему извещению на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

К заявлению на участие в аукционе прилагаются: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица – для юридического лица, зарегистрированного в установленном порядке на территории Республики Беларусь; легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (должна быть произведена не ранее чем за шесть месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский или русский язык – для юридического лица, не зарегистрированного в установленном порядке на территории Республики Беларусь. При подаче заявления на участие в аукционе и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются: физическим лицом – документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя, и нотариально заверенная доверенность; представителем юридического лица (в том числе уполномоченным должностным лицом) – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**До подачи заявления физическому лицу необходимо открыть и/или иметь при себе открытый текущий (расчетный) счет, предварительно ознакомиться с условиями оплаты вознаграждений банку за оказанные услуги (перечисление и возврат суммы задатка), предоставить необходимые реквизиты**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина 2/1, кабинет № 117, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 26 мая по 18 июня 2025 года.** Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона после опубликования извещения вправе в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до даты проведения аукциона отказаться от его проведения.

Аукцион проводится в соответствии со ст. 137 Жилищного кодекса Республики Беларусь и Положением об организации и проведении аукциона по принудительной продаже жилого помещения, утвержденным приказом организатора аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе. Лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (единственный участник несостоявшегося аукциона).

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся соответственно победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан внести плату за предмет аукциона с учетом затрат на отчуждение жилого помещения. Размер фактических затрат на организацию и проведение аукциона, изготовление документации, необходимой для его проведения, доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись.

Адреса сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета **http://www.grodno.gov.by,** ГП «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by**

# Крынічка

Вядучая рубрыкі Марына ВЯРЭНІЧ.

# ПРЫШЧЫПКІ ДЛЯ КВЕТКАВЫХ

**У спіс спраў пры вырошчванні кветкавых культур уваходзіць прышчыпка (пінцыроўка). Што гэта за працэдура, якім раслінам патрэбна абавязкова, а якім — па жаданні, калі яе лепш праводзіць?**



## Крыху тэорыі

Прышчыпка — гэта выдаленне пункта росту, то-бок вяршка цэнтральнага сцябла расліны, што спрыяе абуджэнню спячых пупышак і развіццю бакавых парасткаў.

***Для правядзення пінцыроўкі існуе дзве галоўныя падставы:***

- фарміраванне акуратнага знешняга выгляду куста;
- больш багатае цвіценне ў дэкаратыўных культур і павышэнне ўраджаю ў агароднінных за кошт павелічэння колькасці атожылкаў.

Без выдалення верхняга пункта росту многія расліны будуць развівацца ў адзін-тры сцяблы і замест акуратнага кампактнага кусціка ў дарослым узросце стануць падобныя на доўгую «палку» з адзіночнай кветкай на верхавіне. Своечасовае прышчыпванне дазваляе гэтага пазбегнуць і атрымаць максімум ад кветкавых культур. Акрамя карысці для развіцця і павышэння дэкаратыўнасці раслін, адрэзанае верхавін дае кветкаводу дадатковую выгаду — абрэзаныя часткі парасткаў у большасці выпадкаў можна выкарыстоўваць у якасці чаранкоў для размнажэння.

## Прышчыпваем аднагадовыя...

Пачынаць прышчыпваць аднагадоўкі неабходна яшчэ на стадыі расады, асабліва важна гэта для культур, якія высейваюць у ранніх тэрміны — у канцы зімы або ў першыя вясновыя месяцы. Без своечасовай пінцыроўкі (і ва ўмовах недахопу святла) расліны выцягваюцца, сцёблы становяцца тонкімі, кволымі і ў рэшце рэшт палягаюць пад уласнай вагой. Таму рэкамендуецца прышчыпваць расаду агератуму, алісуму, аксамітак, гвазджыкі кітайскіх, гадэцыі, колеусу, лабеліі, ільвінага зеву, пятуніі і іншых.

У многіх з пералічаных аднагадовак апошнім часам выведзены нізкарослыя сарты і гібрыды — у такіх выпадках прышчыпка не абавязковая, але ўсё роўна можа выкарыстоўвацца як спосаб фарміравання патрэбнай вам формы куста. А вось раслінам буйнарослых сартоў пінцыроўка вельмі неабходная, яна дапамагае стрымліваць рост і рэгуляваць цвіценне.

## ...шматгадовыя

Пры вырошчванні шматгадовых кветкавых культур прышчыпванне таксама мае немалое значэнне і можа праводзіцца аднаразова або ў некалькі этапаў. Сярод такіх раслін: астры шматгадовыя, бальзамін, вяргіні, кляома, касмея, пеларгонія, куставыя ружы, хрызантэмы. У большасці шматгадовых прышчыпку робяць у маладым узросце, калі фарміруецца кусцік, — гэта дазваляе атрымаць кампактную, невысокую, добра разгалінаваную расліну, якая дасць бутоны і суквецці на кожным сцябле. Далей атожылкі, што адрастаюць, можна прышчыпваць, калі яны занадта выцягваюцца або парушаюць задуманую форму куста. Што датычыцца хрызантэм, то прышчыпка для іх — неабходная працэдура, якую праводзяць у самым пачатку актыўнага росту альбо адразу пасля перасадкі расады ў адкрыты грунт. У далейшым спосаб фарміравання залежыць ад віду: дробнакветкавыя прышчыпваюць паўторна пасля адрастання 2-4-х парасткаў, а ў буйнакветкавых відаў рэкамендуецца выдаліць цэнтральную верхавіну ў тым выпадку, калі трэба атрымаць не адну, а некалькі кветак на кожнай расліне.

## ...кучаравыя ліяны

На дачных участках можна сустрэць велізарнае мноства раслін, якія плятуцца. Імі ўпрыгожваюць аркі і пергалы, дэкарыруюць непрывабныя платы і сценкі гаспадарчых пабудоў. Сярод іх ёсць аднагадовыя і шматгадовыя культуры, а таксама тыя, якія ў сярэдняй паласе вырошчваюць у якасці аднaлетак: бугенвілея, духмяны гарошак, бружмель, іпамея, клематіс, кабея, лімоннік кітайскі, настурка, пляцістыя ружы.

У большасці ліян сцёблы ў кароткія тэрміны здольны вырастаць ад 3-4 да 12 метраў, заплятаючы сабой апоры і навесы. Каб такая жывая агароджа атрымалася яшчэ больш пышнай і прыгожай, галоўныя парасткі ліян прышчыпваюць — гэта дапамагае стымуляваць галінаванне і хутка нарошчваць зялёную масу. Нягледзячы на ўяўную прастату працэдуры прышчыпвання, нельга недаацэньваць яе важнасць для фарміравання здаровых, а галоўнае — прыгожых галінастых з пышнай кветценню кусцікаў амаль любой кветкавай культуры.






Фота Лізаветы ГОЛАД.

## 23 МАЯ Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1761** год — горад Шчучын атрымаў Магдэбургскае права і герб, які ўяўляе сабой барокавы шчыт, у блакітным полі яго — выява залатой кароны, пад ёй — сярэбраная манаграма «I» і «S». У сучаснай Беларусі афіцыйны статус атрымаў 17 ліпеня 2006 года.

**1910** год — Янка Купала закончыў сваю паэму-баладу «Курган». Упершыню надрукавана ў газеце «Наша Ніва» 21 чэрвеня 1912 года. Паэма прысвечана лёсу мастака ў грамадстве. «Курган» — шэдэўр не толькі Я. Купалы, але і ўсёй новай беларускай літаратуры. Паэма перакладалася на многія замежныя мовы, у тым ліку на азербайджанскую, англійскую, армянскую, асецінскую, балгарскую, кітайскую, латышскую, літоўскую, рускую, украінскую, узбекскую, румынскую і іншыя.

**1996** год — пад Баранавічамі разбіўся ваенны самалёт Су-27. Загінуў пілот Уладзімір Карват, які адвёў шматтонную машыну ад населенага пункта. Пасмяротна ён быў узнагароджаны званнем Герой Беларусі (упершыню ў краіне).

**У свеце**

**1592** год — у Венецыі інквізіцыя арыштавала філосафа і паэта, манаха-дамініканца Джардана Бруна. За свае прагрэсіўныя погляды Бруна быў асуджаны каталіцкай царквой як ерэтык і прыгавораны свецкімі судовымі ўладамі Рыма да смяротнага пакарання праз спаленне на вогнішчы.

**1885** год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Зубаў, рускі акіянолаг і палярны даследчык, інжынер-контр-адмірал, доктар геалагічных навук, прафесар. Заснавальнік кафедраў акіяналогіі ў Маскоўскім гідраметэаралагічным інстытуце і ў МДУ. Кіраўнік шматлікіх арктычных экспедыцый. Адзін з заснавальнікаў навукі пра льды. Аўтар навуковых прац па лядовых прагнозах у арктычных морах. Распрацоўваў вучэнне аб пралівах. У яго гонар названы заліў у Антарктыдзе.

**1959** год — нарадзіласяЛарыса Андрэеўна Гузеева, савецкая і расійская актрыса кіно, заслужаная артыстка Расійскай Федэрацыі. Здымалася ў фільмах «Жорсткі раманс», «Чужыя тут не ходзяць», «Жаночая логіка», «Сямейная вячэра» і многіх іншых.

НАДВОР'Е

# ПРЫПЯЧЭ ДА ПЛЮС 26 °С

## Чакаюцца моцныя дажджы і навальніцы

**Упэўнена аб камфортным надвор'і вясной можна казаць, калі начная тэмпература устанаўліваецца з істотным плюсам, падкрэслілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння днём у многіх раёнах прагназуюцца моцныя дажджы і навальніцы. Вецер ноччу паўднёвы ад слабага да ўмеранага, днём з пераходам на паўночны ўмераны, у многіх месцах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы плюс 9—15 °С, а максімальная днём складзе ад 12 °С па паўночным захадзе да 26 °С па паўднёвым усходзе краіны.

Свежае надвор'е чакаецца ноччу ўжо ў суботу. Заходнія рэгіёны краіны апынуцца пад уплывам халодных паветраных мас. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў парывісты, удзень у многіх раёнах моцны. Тэмпература паветра ўначы плюс 6—13 °С, па паўднёвым усходзе краіны да 15 °С. Максімальная тэмпература днём складзе ад 9 °С па паўночным захадзе да 26 °С па паўднёвым усходзе рэспублікі.

Тэмпературныя «арэлі» працягнуцца і ў нядзелю. Ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём пераважна на паўднёва-ўсходняй палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі моцныя, і навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўночнай чвэрці парывісты, удзень пры навальніцах моцны. Тэмпература паветра ўначы месцамі па захадзе апусціцца да плюс 2 °С, але па ўсходзе краіны да 14 градусаў цяпла. Максімальная тэмпература днём будзе цалкам майская — 12—18 °С, а па ўсходзе Беларусі — 19—26 °С.

У МНС нагадваюць пра фактары небяспекі ў такое надвор'е. Прынамсі, здараюцца пашкоджанні, абрывы ліній сувязі і электраперадачы, перабоі, адключэнне энергазабеспячэння, адключэнне электрычных падстанцый, электраэнергіі ў населеных пунктах. Магчыма ўзнікненне лясных пажараў, пажараў у жылых і вытворчых будынках, значнае зніжэнне бачнасці і цяжкасць руху транспарту аж да яго поўнага спынення. Ёсць рызыка блакіравання людзей у падвальных і заглыбленых памяшканнях, у грамадскім і асабістым транспарце, падтаплення асобных дамоў, агародаў, сельгасугоддзяў і аўтадарог мясцовага значэння.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспл. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 036. Індэкс 63850. Зак. № 1054.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12